Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІНФАРМАТЫКІ
І РАДЫЁЭЛЕКТРОНІКІ

Кафедра філасофіі

І.Ф. Габрусь, У.І. Міськевіч, Ю.А. Харын

# ДУХОЎНАЯ СІНЭРГІЯ: АДУКАЦЫЯ І АСВЕТНІЦТВА

Навучальны дапаможнік па курсу філасофіі
для студэнтаў і аспірантаў

Пад рэдакцыяй У.І. Міськевіча

Мінск 2002

Библиотека БГУИР

УДК 1М (075.8)
ББК 87 я 73
Г 12

Р э ц э н з е н т ы:
д-р філас. навук, праф. Н.І. Латыш;
д-р філас. навук, праф.Т.М. Алпеева.

**Габрусь І.Ф.**

Г 12 Духоўная сінэргія: адукацыя і асветніцтва: Навуч. дапаможнік па курсу філасофіі для студэнтаў і аспірантаў / І.Ф. Габрусь, У.І.Міськевіч, Ю.А. Харын; пад рэд. У.І.Міськевіча. – Мн.: БГУІР, 2002. – 58 с.

ISBN 985-444-424-4

У дапаможніку раскрываецца філасофскае разуменне духоўнай сінэргіі. Даецца яе структурна-функцыянальны аналіз. З акцэнтаваннем зместу такіх яе важнейшых складальнікаў, як адукацыя і асветніцтва. Аналізуюцца праблемы сучаснай сацыяльнай і духоўнай сінэргіі беларускага грамадства.

**УДК 1М (075.8)**
**ББК 87 я 73**

**ISBN 985-444-424-4**

© І.Ф. Габрусь, У.І. Міськевіч, Ю.А. Харын, 2002
© БГУІР, 2002

Библиотека БГУИР

# Уводзіны

Веды, асветніцтва і адукацыя належаць да найважнейшых набыткаў цывілізацыі. У сваёй сукупнасці яны ўтвараюць механізм, праз які передаецца соцыякультурны вопыт ад аднаго пакалення да другога, а таксама здзейсняецца працэс сацыялізацыі асобы. Характар і функцыянаванне гэтага механізма залежыць ад многіх чыннікаў, галоўнымі сярод якіх з'яўляюцца светапоглядныя імператывы соцыума, яго практычныя патрэбы, жадаемы тып асобы.

Сёння, ва ўмовах пашырэння працэсаў глабалізацыі (якія знітоўваюць ў адно цэлае эканомікі розных краін, а таксама інфармацыйныя прасторы) істотную ролю адыгрывае і сфера адукацыі. Яна палягае ў тым, каб, па-першае, выпрацаваць новую адукацыйную парадыгму, адпавядаючую выклікам XXI ст., па-другое, стаць на справе "мастом" між рознымі культурамі, па-трэцяе, забяспечыць умовы для паўнацэннага станаўлення і развіцця асобы, скіраванай на каштоўнасці чалавечай салідарнасці і гуманізма.

Выкладзеная агульнатэарэтычная пастаноўка пытанняў патрабуе больш дэталёвага аналізу, калі гаворка заходзіць аб іх практычным здзяйсненні. Таму ў прапануемым дапаможніку побач з філасофскім асэнсаваннем праблем адукацыі і асветніцтва разглядаецца канкрэтны — беларускі — кантэкст (гістарычны, культурны, геапалітычны) іх развіцця і ўвасаблення. Даследаванне дзеючых тэндэнцый гэтага працэсу дазволіць даць цэласнае ўяўленне аб рэчаіснасці, ад якой у многім будзе залежыць вобраз нашай краіны у XXI ст.

Библиотека БГУИР

## 1. Вобразы і ўзоры філасофскай думкі

Чалавецтва ўваходзіць у новае тысячагоддзе з супярэчлівай спадчынай свайго нядаўняга мінулага. Да таго ж з сацыяльнымі, эканамічнымі, экалагічнымі і іншымі калізіямі ўсё выразней і трывожней спалучаюцца раней невядомыя людзям феномены глабалізацыі, гомутарызацыі (ад гомо + камп'ютар), інтэрнэтызацыі, вестэрнізацыі, тэрарыстычнага нігілізму, дэмаралізацыі і бяскрайняга плюралізму. Сталі звыклымі сучасныя намінацыі чалавека: чалавек – "клавішнік" (які націскае пальцамі на кнопкі камп'ютара), "гольдмэн" (прадстаўнік залатога міліярду), "новы рускі", "кілер", "зомбі " і г.д.

Сучасныя змены ў грамадскім жыцці і настроі думак людзей патрабуюць адэкватнага філасофскага асэнсавання. Філасофія заўседы прэтэндавала на ролю "духоўнай квінтэсэнцыі эпохі" (К.Маркс). У рэалізацыі падобнай функцыі асабліва бачнымі з'яўляюцца ўзоры і вобразы філасофскай думкі. Што датычыцца ўзораў, то справа тут здаецца больш-менш зразумелай. Узор – гэта персаніфікаваны ідэал філасофствавання. Кожны вольны выбраць свайго куміра – ці то для прафесійнай тэарэтычнай рэфлексіі ці для індывідуальнай светапогляднай платформы асэнсавання навакольнай рэчаіснасці. Такімі "ўзорамі " філасофскай думкі былі і застаюцца Платон, Арыстоцель, Аўгусцін, Фама Аквінскі, Хайдэгер і шмат якія іншыя выдатныя мысліцелі.

З "вобразамі " ж філасофскай думкі сітуацыя істотна іншая. Перш за ўсе гэтае паняцце характэрызуе не знешнюю для самога фігуранта-мысліцеля асаблівасць, а прыналежнасць да сферы іманентнага структуравання светапогляднага вучэння.

У філасофіі як спецыфічным феномене духоўнай сінергіі адрозніваюць: вучэнні, школы, плыні, напрамкі. Матэрыялізм, ідэалізм, дуалізм (па першаму боку асноўнага гнасеалагічнага пытання); агнастыцызм, скептыцызм і інш. (па другому боку таго ж пытання); эмпірызм, рацыяналізм, сенсуалізм, інтуітывізм і інш. (па спосабу пазнання рэчаіснасці ), дыялектызм, рэлятывізм, сафістыку, эклектыку і г.д. (па характару светапоглядных развażанняў ); спекулятыўныя, рэлігійныя, сцыентысцкія, антысцыентысцкія, мастацка-эмацыянальныя, ірацыянальныя вучэнні; старажытную, сярэднявечную, эпоху Адраджэння, Новага часу, сучасную філасофію (па гістарычных эпохах), антычную, арабскую, англійскую, французскую, нямецкую, рускую, савецкую, амерыканскую і т.п. (па краінах).

Сярод розных спосабаў самаасмыслення філасофіі павінен быць выдзелены ў якасці сваеасаблівай прэзумцыі яе вобраз думкі.

У прынцыпе паняцце "вобраз філасофскай думкі" гэтак жа натуральнае, як і выраз "вобраз рэлігійны", "мастацкі", "ідэнтычны", "этычны", "навуковы" і т.п. Як у агульным выпадку, вобраз філасофскай думкі ўтрымлівае пачуццёва –наглядны элемент. Так, прынята (у абарачэнні) у адносінах да старажытнаіндыйскай філасофіі згадваць пра такі яе спецыфічны сімвал, як

Библиотека БГУИР

кола (сансара – вобраз пераўвасобленай душы). У старажытным Кітаі вобраз філасофскай думкі выяўляецца цыклам – сімвалам традыцыйнасці і рытуальнасці. Вобраз антычнай філасофіі змяшчаецца у метафары стралы – сімвала, накіраванага на будучыню мыслення.

Далей узніклі новыя вобразы. Аўгусцін, напрыклад, выявіў істотныя рысы хрысціянска-філасофскай думкі вобразам крыжа, у пункце перасячэння вертыкальнай і гарызантальнай ліній якога супадаюць распяцце сына Божага і сэрца верніка. Філасофскім знакам эпохі Адраджэння стала алегорыя Леанарда да Вінчы – чалавек, упісаны ў круг і квадрат.

Пазней таксама былі свае пачуццевыя філасофскія рэаліі: “чалавек–машина” ў поглядах механістычнага матэрыялізму, гегелеўская сава Мінервы як вобраз спекулятыўнага мыслення, “звышчалавек” (Ніцшэ) і Праметэй (К.Маркс) і інш.

Побач з пачуццёва–наглядными сімваламі абавязковай састаўляючай вобраза філасофскай думкі з’яўляецца лагічная кампанента. Яна складаецца з імкнення мысляра да сістэмнасці, доказнасці, узгодненасці часцей за ўсё сваіх сцвярджэнняў з эмпірычным вопытам і навуковым пазнаннем. Ірацыяналістычныя вучэнні таксама не з’уляюцца выключэннем. У таго ж Ніцшэ (“філасофія жыцця”) у калейдаскопе фрагментаў і афарызмаў выразна праглядваюць лагічныя асновы яго вучэння (“воля да ўлады”, “вечнае вяртанне”, “пераацэнка каштоўнасцей”, “нігілізм”, “звышчалавек”).

І вядома ж, пры акрэсленні зместу паняцця, якое цікавіць нас, нельга не выдзяліць яе каштоўнасную (аксіалагічную) састаўляючую. У тым ці іншым вобразе філасофскай думкі так ці інакш праяўляюцца ў рэшце рэшт і абгрунтоўваюцца сацыяльныя імкненні і ідэалы, вераванні і сумненні людзей, іх каштоўнасныя перавагі і арыентацыі, супярэчнасці экзістэнцыяльнага ўспрымання падзей свету паўсядзённасці, установак чалавечага дзеяння.

У чалавека, побач з яго вядомымі характарыстыкамі (Homo sapiense, Homo ludens, Homo pulshers і інш.) ёсць і такая прыкмета: Homo philosophius – чалавек, які філасофствуе. З усіх жывых істот толькі людзі здольныя выдзяляць сябе з навакольнага свету і разважаць пра свае адносіны да яго, пра ўласнае “Я”, аб “вечных” праблемах быцця і пазнання – ісціне, дзеянні, прасторы, часе, Богу, прыгажосці, пра дабро, законы прыроды і т.п.

Але ёсць адрозненні у філасофстваванні “прафанным” (уласцівым увогуле кожнаму) і “прафесійным”, якое прэтэндуе на агульназначны статус “эпохі, схопленай у думцы” (Гегель).

Якраз такое філасофстваванне азначае філасофію ў сапраўдным сэнсе гэтага слова. Менавіта яна становіцца прадметам вывучэння ў школе, перш за ўсё ў вышэйшай, а зараз ўсё часцей і ў сярэдняй. Менавіта спасціжэнне зместу гэтага прадмета фарміруе філасофскую культуру сучаснага чалавека. Як раз тут, у рэшце рэшт, і вырашаецца у першую чаргу пытанне, “што значыць філасофскі мысліць?”. Адказ на гэта пытанне патрабуе падрабязнага тлумачэння. Яно знаходзіцца ў філасофскіх кнігах і падручніках.

Библиотека БГУИР

Адзначым тут толькі, што ў школьнай светапогляднай сінэргіі важна арыентаваць навучэнцаў (вучняў, студэнтаў) на сур'ёзнае разуменне структуры вобраза філасофскай думкі і ўменне самастойна рабіць правільны каштоўнасны выбар.

Калі ж звярнуцца зараз да аналіза структуры паняцця, якое цікавіць нас, то вылучым у вобразе філасофскай думкі наступныя складальнікі .

1. Гнасеалагічная пазіцыя мысляра. Яна заключаецца ў прызнанні ці адмаўленні ім аб'ектыунай рэчаіснасці, у прыхільнасці да сенсуалізма ці рацыяналізма, у апоры на веды ці рэлігійную веру, у спадзяванні на логіку ці інтуіцыю і т.п.

2. Парадыгмальная манера (стыль) філасофствавання.

У гісторыі філасофіі выяўляюцца розныя манеры выкладання светапоглядных перакананняў – сістэмна-міфалагічная (Платон, Плоцін), логіка–навуковая (Арыстоцель, Дэкарт, Гегель і інш.), паэтычна–мастацкая (Лукрэцый Кар, Ніцшэ, Сартр), рэлігійна–спекулятыўная (Аўгусцін, Фама Аквінскі) і інш.

3. Рэгулятыўны прынцып вырашэння светапоглядных праблем. Філасофія выпрацавала шэраг такіх прынцыпаў: дыялектычны, аўтарытарна–дагматычны, сафістычны, эклектычны, суб'ектывісцкі, рэлятывісцкі, тэалагічны і інш.

4. Дамінантнасць каштоўнаснай арыентацыі філасофскага вучэння.

У якасці дамінантных арыентацый могуць быць апалагетыка, сацыяльнае адмаўленне, нігілізм, аптымізм, песімізм, сацыяльная талерантнасць, класавыя інтарэсы, нацыяналізм, расізм, этнічныя, навуковыя, агульначалавечыя каштоўнасці, навука, рэлігія, мараль, дзяржава і інш.

Названых складальнікаў вобраза філасофскай думкі, г. зн. таго, што з'уляецца "філасофіяй" ва ўласным значэнні гэтага тэрміна, цалкам дастаткова для выяўлення ролі канкрэтных светапоглядных вучэнняў у духоўнай сінэргіі . Так, у першай палове XX стагоддзя найбольш уплывовымі вобразамі філасофіі (вобразамі філасофскай думкі) былі пазітывізм (неапазітывізм), экзістэнцыялізм, неатамізм, дыялектычны матэрыялізм. Вядома, існавалі і іншыя формы светапогляднага асэнсавання рэчаіснасці (фенаменалагічная, антрапалагізм, прагматызм, герменэўтыка, структуралізм і інш.). Але ж дамініравалі згаданыя раней філасофскія погляды. Пры гэтым пастпазітывізм (Айер, Поппер, Вітгенштэйн і інш) звяртаўся да колаў навуковай і тэхнічнай інтэлігенцыі, частцы якой імпанавала абвешчаная прыхільнікамі "станоўчых" ведаў яго светапоглядная нейтральнасць.

Гэтай гнасеалагічнай пазіцыі цалкам адпавядала парадыгмальная манера філасофствавання – цалкам сцыентысцкая, з выкарыстаннем навуковага апарата дакладных дысціплін (матэматыкі, фізікі, фармальнай логікі). Рэгулятыўныя прынцыпы вырашэння філасофскіх праблем (прынцыпы фізікалізму, верыфікацыі, фальсіфікацыі, канвенцыялізму) зноў жа выводзіліся з аднабаковага, абстрактнага тлумачэння сутнасці навуковых ведаў.

Библиотека БГУИР

У каштоўнасных жа арыентацыях сучаснага пазітывізму дамінуюць ідэалы лібералізму, індэтэрмінізму, непрыняцце “гістарыцызму” (сацыялізму).

Экзістэнцыялісцкі ж вобраз філасофскай думкі (асабліва распаўсюджаны ў мастацка–творчым асяроддзі і ў слаях маргіналаў) характарызуецца паэлементна так: а) гнасеалагічная пазіцыя – суб’ектыўнасць асобасных перажыванняў чалавека ў стане псіхалагічнага цвішэнізму, яго быцця ў “памежных сітуацыях”; б) стыль філасофствавання – сэнсавобразная міфатворчасць (Сартр, Камю), спекулятыўна–лінгвістычная рэфлексія (Хайдэгер, Ясперс); в) рэгулятыўны прынцып абмеркавання філасофскай праблематыкі – пазіцыя самотнага чалавека, закінутага у чужы свет, суб’ектывісцкая дыялектыка негатыўных экзістэнцыяльных пачуццяў страху, адчаю, віны, нуды; г) у якасці аксіалагічных дамінант тут аказваюцца каштоўнасці сацыяльна адчужанага, ізаляванага індывіда, уласная экзістэнцыя, Geheuse (шкарлупіна, футляр), у якой можна схавацца у жаху перад варожай рэчаіснасцю і Богам.

Аналагічна можна раскрыць соцыакультурную структуру і іншых адзначаных вышэй вобразаў філасофіі XX стагоддзя. Зараз жа перайдзём да разгляду асаблівасцяў сучасных вобразаў філасофскай думкі .

Сярод фактараў, што аказваюць асаблівы ўплыў на духоўнае жыццё постсавецкага грамадства, у першую чаргу павінны быць названы ўзнікненне стану сацыяльнага цвішэнізму, усталяванне татальнага плюралізму і распаўсюджанне ў навуковых колах сінергетычнага ўспрымання.

Зазначаныя феномены карэнным чынам змянілі становішча з духоўнай сінэргіяй у нашым грамадстве. Інтэгратыўнае яе ядро ў Савецкім Саюзе аб’ектыўна стваралася паўсюдным засваеннем (у тым ліку пры інстытуцыяльным абучэнні навучэнцаў у школе і вну) дыялектыка-матэрыялістычнага вобраза думкі. Зараз жа ўсе змянілася. Цвішэнізм выклікаў неабходнасць духоўнага выбару. Плюралізм як бы дае дазвол на абсалютную абыякавасць грамадства да гэтага выбару індывіда. Сінэргетыка ж пры павярхоўнай яе трактоўцы як бы абавязвае ўзводзіць у статус бясспрэчнай рэальнасці стан Хаоса. Натуральна, што грамадская думка, да таго ж зараз жорстка маніпуліруемая, не магла адэкватным чынам не прарэагаваць на яе “жывой душой” – вобразам філасофскай думкі.

Так, марксісцка-ленінскі яе вобраз амаль цалкам знік з пераважнай большасці сучасных падручнікаў, дысертацый, кніг. Але што супрацьпастаўляецца ў нашы дні матэрыялістычнай дыялектыцы? Як быць настаўніку, выкладчыку, якія жадаюць, каб навучэнцы засвоілі сістэмы фундаментальных ідэй аб сусвеце, адносінах да яго чалавека, аб самім чалавеку, яго сацыяльных дзеяннях, ідэалах і перспектывах развіцця соцыума? Бо ўсё больш адчувальна выяўляюцца ў кангламераце філасофскіх рэалій такія вобразы філасофіі, як постмадэрнізм і квазіпрыродазнаўчы дуалізм, якія ўяўляюцца многім нашым суайчыннікам найбольш прыймальнымі.

Библиотека БГУИР

Сутнасць светапогляднага постмадэрнізму можа быць раскрыта на падставе вядомага вызначэння філасофіі, якое далі ў сваёй кнізе Дэлёз і Гваторы. Філасофія – безупынная творчасць канцэптаў. А яшчэ мы чулі такое: “Філасофія – гэта мысленне дзеля мыслення накшталт чыстага мастацтва” (Мамардашвілі). Канцэпты можна ствараць зусім без звароту да якой-небудзь прадметнасці. Гэта апраўдвае любую суб’ектыунасць у гнасеалагічнай пазіцыі філосафа. Парадыгмальнай манерай філасофствавання ў постмадэрністаў становіцца “заляцанне” з тэрмінамі (рызома, наратыў, хаос, псіхааналіз, нелінейнасць, біфуркацыя, сімулякр, дэтэрытарызацыя, складка і інш.), якія звязаны з сінэргетыкай, і запазычаных з асобных навуковых дысціплін. У якасці рэгулятыўных прынцыпаў светапогляднага мыслення навязваюцца інтэнцыі эклектызму, дэструкцыі, рэлятывізму, перанос акцэнтаў філасофскіх разважанняў на перыферыйную праблематыку. Адпаведна ў каштоўнаснай свядомасці дамінантамі выступаюць арыентацыі на феномены свету штодзённасці, суб’ектывізм, сацыяльны плюралізм і этычны нігілізм.

Калі ўкараненне ў грамадскую свядомасць постмадэрнісцкіх установак яшчэ больш узмацняе яе небяспечную цвішэнізацыю (паглыбленне светапогляднага скептыцызму, крызісу маральных каштоўнасцей, соцыякультурнай дэградацыі грамадства, стану глабальнай нестабільнасці ), то адзначаны вышэй квазіпрыродазнаўчы рэлігійны дуалізм узнаўляе ў сучасных умовах, здавалася б, даўно пераадолены вобраз філасофскай думкі, які лічыўся ўжо архаічным. Сапраўды, усё часцей мы сёння сутыкаемся з дзіўнай з’явай – сур’ёзныя вучоныя запэўніваюць публіку, што, напрыклад, паддаецца пераканаўчаму лагічнаму абгрунтаванню дагмат трагічнасці хрысціянскага Бога (акадэмік Б. Раўшэнбах), пра наяўнасць сусветнага “семантычнага універсума” (Налімаў), член-карэспандэнт РАН А. Кузін сцвярджае, што інфармацыя – духоўны пачатак, і гэты пачатак уласцівы ўсяму Сусвету (Вопросы философии , 1998, №8, с.169).

Філосаф К. Карманаў у кнізе “Введение в проблематику идеального ” (М., 1999) заяўляе, што ў прыродзе ёсць “фізічная” і “метафізічная” рэальнасці, пры чым “фізічная” знаходзіцца ў сферы “матафізічнага”. А апошняя “у глабальным маштабе ўяўляе сабой асяроддзе па тыпу энергіі ці сілы. Яе спецыфічнасць у тым, што гэта дазваляе згаданай “метафізічнай” рэальнасці выконваць функцыі “глабальнага кіраўнічага працэсу” (а прасцей кажучы – таго ж Бога).

Што трэба сказаць пра такія, сёння зусім не рэдкія, выказванні ? Перш за усё яны выражаюць у рэшце рэшт гнасеалагічную пазіцыю рэлігійнага дуалізма, які толькі сарамліва называе часцей за усё “старога” Бога сучаснымі моднымі слоўцамі (“глабальны кіраўнічы працэс”, “семантычны універсум” і д.п.). Парадыгмальная манера філасофствавання – цалкам сцыентысцкая, а па сутнасці квазіпрыродазнаўчая, арыентаваная на чытачоў, якія мысляць ф1ласофскі “прафанна”.

Рэгулятыўныя прынцыпы вырашэння філасофскай праблематыкі тут усё тыя ж, што і ў мінулых гістарычных глыбінях метафізікі – сафістыка. Нарэшце,

Библиотека БГУИР

у каштоўнасных арыентацыях дамінуе ўстаноўка на яднанне навукі і рэлігіі, а дакладней нават – на падначаленне навукі тэалагічнаму дагматызму.

Разглядаемы вобраз філасофскай думкі праяўляецца зараз у самых нечаканых формах. Калісьці спрабавалі прадставіць сацыялізм новай рэлігіяй (Луначарскі). У наш час заклікаюць да таго, каб сама адукацыя была “новай сусветнай Рэлігіяй”, “новай крынічнай асновай Веравучэння”. Не будзем тут уступаць у дыскусію аб сутнасці “Рэлігіі” і месцы “Веравучэння” ў свецкай школе. Заўважым толькі, што паняцце веры далёка не вычэрпваецца толькі яе рэлігійным сэнсам. Акрамя рэлігійнай ёсць яшчэ вера гнасеалагічная, экзістэнцыяльная, практычная. Але гэта патрабуе асаблівай размовы. А пакуль пагадзімся, што ні постмадэрнісцкі, ні квазіпрыродазнаўчы рэлігійны дуалістычны вобразы філасофіі не могуць і не павінны быць безумоўна рэкамендаваны да ўкаранення ў працэс інстытуцыяльнай адукацыйнай сінэргіі.

Але ў такім выпадку якое ж з філасофскіх сучасных вучэнняў мае патэнцыі фарміравання цэласнага і аптымальнага ў цяперашніх цвішэнісцкіх умовах погляда на рэчаіснасць? Вылучым з іх разнастайнасці матэрыялістычную дыялектыку.

Прафесар Дзюскенскага універсітэта (ЗША) Т.Рокмар піша, што “марксізм састарэў і павінен быць адкінуты, але Маркс застанецца значным і зберажэ сваё значэнне да тае пары, пакуль будзе існаваць развітае індустрыяльнае грамадства”.

З развалам Савецкага Саюза і ўсталяваннем капіталістычных рынкавых адносін марксізм не толькі паўсюдна адкінуты, але нават імя Карла Маркса (і Леніна) выкраслена з многіх сучасных публікацый (гл., напрыклад, Философский энциклопедический словарь. М., 2000). А між тым мае рацыю амерыканскі вучоны, які бачыць значэнне Маркса на далёкую перспектыву. Але як раздзяліць “Маркса” і “марксізм”? Не будзем браць у разлік розныя падробкі пад вучэнне заснавальніка рэвалюцыйнага гуманізма. У марксізме (палітычных, эканамічных і філасофскіх поглядах) за мінулыя больш як 150 гадоў пры ўсіх выкліканых жыццём вялікіх падзеях, супярэчнасцях, фактах, навуковых адкрыццях, высокіх тэхналогіях, сацыякультурных трансфармацыях – непазбежна многае павінна было састарэць і яго трэба было “адкінуць”. Шмат і таго, што патрабуе перагляду. Крытычны самааналіз тэарэтыкамі марксізма ўжо пачаты (гл. артыкул акадэміка Т.У. Ойзермана ў часопісе “Вопросы философии”, 2000, №2).

Удакладнення і развіцця патрабуюць нават фундаментальныя палажэнні марксісцка-ленінскай філасофіі. Так, славутая ленінская гнасеалагічная трактоўка матэрыі дапаўняецца яе анталагічным вызначэннем як субстанцыі, якой уласцівы аб’ектыўны атрыбут прастора-часовага дзеяння і суб’ектыўны модус ідэальнасці. Паглыбленне зместу дыялектыкі дасягаецца выяўленнем яе спецыфікі ва ўмовах апасродкавання сацыяльнымі дзеяннямі ўсеагульных законаў. Матэрыялістычнае разуменне гісторыі абнаўляецца фіксацыяй космабіапсіхасацыядухоўнай сутнасці чалавека і т.п. І тым не менш справядліва

Библиотека БГУИР

і актуальна адно – зберажэнне з улікам сучасных рэалій “складальнікаў” ядра марксізма, яго фундаментальных светапоглядных ідэй, яго вобраза філасофскай думкі.

*Гнасеалагічная пазіцыя* – паслядоўны (у адрозненні ад механістычнага, вульгарнага, эканамічнага і д.п.) дыялектычны матэрыялізм;

*Парадыгмальная манера філасофствавання* – арыентацыя на навуковыя веды, але на спасціжэнне быцця праз прызму “дрэва культуры”, а не проста “дрэва ведаў”;

*Рэгулятыўны прынцып вырашэння філасофскіх праблем*- дыялектычная логіка з яе абавязковым успрыманнем экзістэнцыялаў чалавечых дзеянняў.

Каштоўнасную дамінанту сацыяльных імкненняў матэрыялістычная дыялектыка ў часы цяперашняга цвішэнізму і глабалізацыі грамадскіх працэсаў устанаўлівае ў полі практычнага канкрэтна-дзеяснага гуманізму. Сутнасць яе ў тым, што акцэнт з класавага падыходу пераносіцца на агульначалавечыя каштоўнасці, на фарміраванне і выяўленне ў людзей якасцяў узвышанай экзістэнцыі – Дабра, Ісціны, Прыгажосці, Абавязку, Правоў чалавека, Справядлівасці, Дзеяння.

Калі працягваць абмяркоўванне сацыяльнай значнасці дыялектыка–матэрыялістычнага вобраза думкі, то трэба звярнуць увагу і на тое, што тыя альбо іншыя філасофскія ідэі ў рэшце рэшт ствараюць тэарэтычную і метадалагічную базу сацыяльнай, у тым ліку і інстытуцыяльнай адукацыйнай сінэргіі, кіравання працэсам навучання, выхавання і асветы, пошука нацыянальнай ідэі, які вядзецца і зараз у краінах СНД. Безвыніковасць гэтага пошуку вызначаецца ў тым ліку адсутнасцю ў яе распрацоўшчыкаў яснага сістэмнага філасофскага светаразумення. Нічым іншым не растлумачыш спробы фарміравання "нацыянальнай ідэі" спасылкамі на архетыпы менталітэту, рэлігійныя каштоўнасці, прыродна-гістарычнае наканаванне і г.д. Закранутае пытанне складанае, патрабуе спецыяльнага абмеркавання. Таму адзначым тут галоўнае: у мэтадалагічным плане пажадана абапірацца на філасофію, якая прапануе адкрытую светапоглядную аснову для вылучэння ідэй, якія маглі б згуртаваць грамадства. Аўтары упэўнены, што прынцыпы такой філасофіі – матэрыялізм і дыялектыка, а "атрактар" (сіла духоўнага прыцягнення, якая можа быць сфарміравана на іх аснове) – ідэя канкрэтнага, практычна-дзеяснага гуманізму.

Библиотека БГУИР

# 2. Тэарэтыка-метадалагічныя асновы духоўнай сінэргіі

## 2.1 Феномен духоўнай сінэргіі

Як сучасная сацыяльная рэалія асветніцтва – гэта сістэма кагнітыўных і камунікатыўна-ідэялагічных дзеянняў, выконваючых функцыю інтэгратара адукацыйнай сінэргіі ў фарміраванні ў людзях чалавечага пачатку.

Слова "сінэргія" (судзеянне, супольныя дзеянні) было вядома значна раней, чым модны зараз выраз "сінэргетыка", які азначае навуку аб самаарганізацыі. У часы сярэдневечча, прыкладам, было прынята верыць у магчымасць супрацоўніцтва Бога і чалавека. Вядома і тое, што яшчэ ў 1935 г. рускі філосаф І.Лапшын выдаў на французскай мове ў Празе кнігу "Духоўная сінэргія", у якой апісаў узаемапранікненне і ўзаемаўплыў маралі, навукі, мастацтва.

Які сэнс мяркуецца зараз надаць выразу "духоўная сінэргія"? Для філасофска-сацыяльных ведаў гэта, бадай, новы тэрмін, не тоесны па зместу катэгорыям "грамадская свядомасць", "духоўная сфера", "духоўная культура", "духоўная вытворчасць", "ідэялогія" і г.д. Духоўная сінэргія – гэта сукупны вынік працэса супрацоўніцтва, узаемадзеяння ўсёй разнастайнасці форм індывідуальнай і сацыяльнай ментальнасці: светапоглядных патрэб і каштоўнасных арыентацый, пазнавальных пабуджэнняў і маральных імператываў, ідэялагічных установак і псіхалагічных архетыпаў, мэтанакіраванных імкненняў і інстынктыўных імпульсаў, сітуацыйнага настрою і цвёрдых перакананняў, сумненняў, веры, экзістэнцыялаў і нормаў, феноменаў групавой і агульначалавечай свядомасці, праблем і спосабаў іх вырашэння і г.д.

У сталыя перыяды развіцця грамадства ўсталёўваецца адносная раўнавага паміж вышэйпералічанымі рэаліямі духоўнай сінэргіі, іх узаемадзеянне і гарманічнае функцыянаванне.

Зусім па-іншаму выглядае справа ў часы грамадскай нестабільнасці, крызісаў і сацыяльных трансфармацый. У такія перыяды духоўная сінэргія вельмі адчувальная да ўздзеяння падзей агульнасацыяльнага цвішэнізму (ад нем. выразу zwischen – паміж). На парозе ІІІ тысячагоддзя не толькі незалежныя дзяржавы постсавецкай прасторы, але і ўсё чалавецтва апынулася перад многавектарным выбарам – палітычным, эканамічным, тэхналагічным, экалагічным, каштоўнасным, адукацыйным, цывілізацыйным і культурным. Неабходнасць гэтага выбару дыктуецца ўзмацняючыміся крызіснымі з’явамі ў сучасным свеце. Расце няроўнасць паміж дзяржавамі і народамі. Сёння разрыў у сярэднедушавым ВНП паміж грамадзянамі постіндустрыяльнага грамадства і астатняй часткай чалавецтва дасягае 15,4 тыс. долараў, павялічыўшыся з 1960 г. амаль у 3 разы.

Библиотека БГУИР

Такога кшталту тэндэнцыі і іх дынаміка патрабуюць адпаведнага асэнсавання. У свеце культуры зараз назіраецца яе вестэрнізацыя. Камп'ютарнае грамадства з яго сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі нясе ў жыццё людзей не толькі нябачны камфорт, але і новую небяспеку экзістэнцыяльна-духоўнага характару. Трэба адзначыць, што ў перыяды цвішэнізму істотна змяняюцца суадносіны галоўных складальнікаў сацыяльнай сінэргіі ўвогуле і духоўнай яе іпастасі ў прыватнасці, менавіта - працэсаў спантаннасці і мэтарэгулявання. Кожны індывід праходзіць духоўную сацыялізацыю пад уздзеяннем вынікаў як выпадковага характару, так і мэтанакіраваных, мэтарацыянальных уплываў з боку грамадства. На інтэлект індывіда ўздзейнічае яго генэтыка. Разам з тым асобу фарміруе асяроддзе (сям'я, школа, свет штодзеннасці, грамадства, дзяржава).

Але многае залежыць і ад самога чалавека, яго самастойных дзеянняў, яго імкненняў да самарэалізацыі. У часы сацыяльнай дысіпатыўнасці, крызіснага стану грамадства ранейшыя соцыяльнакультурныя імператывы страчваюць сваю былую прадказальнасць, паколькі ў духоўнай сферы грамадства сцвярджаецца плюралізм светапоглядаў і ідэялогій, сацыяльных настрояў і грамадскіх думак, матэрыльны пазітывізм і нігілізм, гнасеалагічны скептыцызм і прымітывізм. Узнікае парадаксальная з'ява: усе большая частка людзей аказваецца ў стане духоўнай невызначанасці, а пануючая эліта рынкава арыентаванага грамадства ўсе відавочней мае патрэбу ў мэтанакіраваным рэгуляванні паводзін людзей аж да магчымага пераўтварэння іх у замбіраваныя, аднамерныя істоты. Канкрэтызуем выкладзеннае і разгледзім некаторыя глыбінныя аспекты сучаснай сінэргіі.

### 2.2. Структуры і супярэчнасці духоўнай сінэргіі

Духоўную сінэргію належыць разглядаць (поруч, напрыклад, з адукацыйнай, кіраўнічай, палітычнай і інш.) як спецыфічную мадыфікацыю сацыяльнай сінэргіі. Тут захоўваецца агульны прынцып узаемадзеяння мэтанакіраванага пачатку шматаспектнымі праявамі спантаннасці. Больш прадметна ў духоўнай сінэргіі выяўляюцца такія асаблівасці як:

- ментальная поліструктурнасць,
- індывідуальна-дзейная бімадальнасць,
- сацыяльная бімадальнасць,
- суб'ект-аб'ектная інтэнцыянальнасць падзей духоўнай сінэргіі ,
- прастора-тэмпаральны зменлівы "атрактарны" пачатак,
- унутраная і вонкавая ўзаемадэтэрмінацыя,
- магчымасць мэтанакіраваный інстытуалізацыі і наўмыснай цвішэнізацыі.

Библиотека БГУИР

Адназначныя асаблівасці разглядаемай сферы грамадскага жыцця дазваляюць яшчэ больш канкрэтна дэталізаваць аналіз праблемы духоўнай сінэргіі. З гэтай мэтай звернемся да тлумачэння некаторых з вышэй названых яе характарыстык.

Так, ментальная поліструктурнасць духоўнай сінэргіі ўтвараецца ў канчатковым выніку са шматстайных феноменаў ментальнасці ці свядомасці. Так, з анталагічнага пункту гледжання, можна фіксаваць сінэргію (сумеснае дзеянне) свядомасці, самасвядомасці, звыш- (над-) свядомасці, падсвядомасці. Гнасеалагічны падыход дазваляе выявіць у сферы свядомасці ў якасці яе вызначальных момантаў адлюстраванне, ацэнку, праект (мэтастаўленне), сэнс. Пры псіхалагічным аналізе ў свядомасці адрозніваюць сэнсорыку, эмоцыі, памяць, волю, мысленне. У кібернэтыцы галоўным у свядомасці лічыцца здольнасць дастасавання арыентавацца ў прасторы і часе на падставе памяці з выкарыстаннем механізму адваротнай сувязі. У сацыяльнай філасофіі вызначаецца спецыфіка індывідуальнай і грамадскай свядомасці.

Індывідуальная і грамадская свядомасць маюць шэраг агульных уласцівасцей – суб’ект-аб’ектную інтэнцыянальнасць, шматфактарную абумоўленасць, унутраную і знешнюю ўзаемадэтэрмінацыю і інш. Разам з тым у рамках дыялектыкі асобнага і агульнага ( індывідуальнай і грамадскай свядомасці) вызначаюцца і іх прыкметныя асаблівасці. Напрыклад, індывідуальная свядомасць банальная, гэта значыць яе трэба разумець як нейкае ідэальнае ўтварэнне, сфарміраванае знешнім асяроддзем, так і прыўнесенае ў гэта адлюстраванне ўнутранага. А для грамадскай свядомасці ў большай меры ўласціва якасць бідамінантнасці: адзінства майго “асабістага” і сацыяльнага (групавых, нацыянальных, агульначалавечых патрэбнасцей, інтарэсау, ідэалогій). Індывідуальная свядомасць, далей, сінкрэтычная, інтэгруе ў сябе шмат ведаў, перажыванняў і адносін (дзеянняў). У грамадскай жа свядомасці можна ў якасці адносна адасобленых складаючых выдзяліць навуку, грамадскую псіхалогію, ідэалогію.

Нарэшце, выяўляюцца істотныя адрозненні і ў функцыях. Індывідуальная свядомаць выконвае кагнітыўную, матывацыйную і нарматыўную функцыі. У грамадскай жа свядомасці гэтыя функцыі робяцца разнастайнымі і шматлікімі. Да іх далучаюцца эстэтычная, прававая, рэлігійная, ідэалагічная і іншыя. Наогул жа толькі ў грамадстве праяўляюцца такія інтэнцыі духоўнасці, як настрой думак: рэвалюцыйна-крытычны, апалагетычны, нігілістычны.

Ужо сказанае пра структурныя кампаненты духоўнай рэальнасці сведчыць пра яе аб’ектыўную складанасць і супярэчлівасць. Але ёсць яшчэ некаторыя істотныя акалічнасці, якія нельга абмінуць, асабліва пры абмеркаванні пытанняў асветы і адукацыі як іманентных феноменаў ментальнасці.

Супярэчнасцей ў сферы духоўнай сінэргіі безліч. Іх можна сістэматызаваць, напрыклад, наступным чынам. Па-першае, у сацыяльным кіраванні сінэргія выяўляецца як супярэчлівае адзінства наўмыснага

Библиотека БГУИР

мэтапалагання і спантаннай дзейнасці мас. Па-другое, паэлементныя структурныя супярэчлівасці духоўнай дзейнасці людзей (індывідуальныя – грамадскія веды, веды – вера, узвышаная экзістэнцыя – бездухоўнасць, інстытуцыянальнасць – самаініцыятыўнасць, маральнасць – маральны нігілізм, асвета – невуцтва, творчасць – дагматызм, самастойнасць – маніпуліраванне, навука – ідэалогія і інш.). Па-трэцяе, у духоўнай сінэргіі, зразумела, знаходзяць свой выраз і адбітак агульнасацыяльныя калізіі, супярэчнасці і канфлікты грамадскага быцця, сфер палітыкі, эканомікі, экалогіі, унутрыдзяржаўных адносін.

Уласцівыя сферам індывідуальнай і сацыяльнай ментальнасці супярэчнасці надаюць з'явам духоўнай сінэргіі аб'ектыўную неадназначнасць у іх дынаміцы, рознавектарнае мэтастаўленне ў асабовых і інстытуалізаваных сацыяльных дзеяннях, павялічваюць ступень неакрэсленасці ў неабходнай гуманізацыі сучаснага соцыума.

Тут трэба сказаць, што супярэчнасці сацыяльнай сінэргіі – сацыяльныя супярэчнасці, гэта значыць, яны ёсць суб'ектна–аб'ектныя і аб'ектна–суб'ектныя адносіны. Сацыяльныя супярэчнасці тлумачацца схемай:

**Ошибка!**




Прыменім гэтую схему да аналізу асветніцтва як важнага фрагменту сучаснай духоўнаі сінэргіі. Прызнанне высокай значнасці асветніцтва ў перыяд станаўлення інфармацыйна-экалагічнага соцыума несумненна. Але ёсць сацыяльныя суб'екты (людзі, групы, арганізацыі), якія не бачаць у ім асаблівай неабходнасці і нават навогул супраціўляюцца яму, пашыраючы па сутнасці невуцтва, маніпуліруючы свядомасцю людзей, абмяжоўваючы доступ да сярэдняй і вышэйшай адукацыі. Да таго ж зараз шмат і тых (дзяцей школьнага ўзросту, дарослых), хто не мае цягі да ведаў, не вучыцца, не займаецца самаадукацыяй, прыхільны да забабонаў і містыкі.

У наяўнасці аб'ектыўная супярэчлівасць інтарэсаў $S_1$ (цывільнага грамадства, дзяржавы) і $S_2$ (вышэйадзначаных катэгорый людзей). Адпаведна супрацьлегласці кагнітыўных інтарэсаў разгортваюцца і сацыяльныя дзеянні. Вынікова $S_1$ імкнецца да асветы, ажыццяўляе рэформу адукацыі адэкватна патрабаванням цяперашняга часу, знаходзіць аптымальныя навуковыя

Библиотека БГУИР

дасягненні. У тых жа ўмовах абагульнены $S_2$ сваімі дзеяннямі (грэбаванне школай, звужэнне адукацыйнай прасторы, распаўсюджанне псеўданавуковай інфармацыі, забабонаў, рэлігійных догмаў, скажэнне ісціны, фальсіфікацыя, прапаганда амаралізму, ідэалагічнай непрымірымасці, паўсюднага нігілізму, дээстэтызацыя і да таго падобнае) нараджаюць і паглыбляюць невуцтва, ідыётызуюць грамадства, наўмысна змагаюцца з асветніцтвам людзей. Пра тое, каго ў наш час належыць лічыць чалавекам адукаваным, пойдзе гаворка далей. А пакуль зафіксуем галоўнае з таго, што сказана, у кантэксце нашае тэмы:

а) дынаміка духоўных працэсаў – спецыфічны модус сацыяльнай сінэргіі;

б) духоўная сінэргія праяўляецца ў поліструктурных узаемадзеяннях рознааспектных элементаў індывідуальнай і сацыяльнай ментальнасці;

в) навуковае асэнсаванне праблем асветніцтва і адукацыі звязана з раскрыццём сутнасці спецыфічных супярэчнасцяў духоўнай сферы жыцця людзей.

## 2.3. Адукацыйная сінэргія

Асобнае месца ў духоўнай сінэргіі займае яе адукацыйны аспект. Некаторыя аўтары (М. Вішнякоў) разглядаюць адукацыю як спецыфічную практыку для філасофіі, светапогляднай тэорыі. Падтрымліваючы ўвогуле гэтае меркаванне, разгледзім больш падрабязна сучасны стан адукацыйнай сінэргіі.

На працягу стагоддзяў веды былі сілай прагрэсу, якая выводзіла чалавека “са стану непаўналецця” (І. Кант). Але зараз узніклі вельмі няпростыя пытанні да навукі, рацыянальных ведаў увогуле. Розум і навука часта разглядаюцца ў якасці галоўных прычын сучасных глабальных праблем – экалагічнай, дэмаграфічнай і інш. Адукацыя заўжды атаясамлялася з асветай, пераадольваннем забабонаў і невуцтва. Але зараз ужо чуваць пытанні: "Ці многа асветы патрэбна чалавеку?" (гл. Человек. 1996. №6). Крыху раней канстатавалася, што "асвета таталітарная" (М.Хоркхаймер, Т. Адорна). Не станем тут засяроджвацца на апраўданні навукі, ведаў, рацыянальнасці. Веды - свет, а асветніцтва ў шырокім сэнсе слова – яго крыніца. Гэта галоўнае.

Звернемся да іншага – тэарэтыка-метадалагічных аспектаў праблемы асветніцтва як важнай характарыстыкі сучаснай адукацыйнай сінэргіі. Асветніцтва складае істотную кампаненту адукацыйнай сінэргіі як у яе вузкай трактоўцы (перадача і засвойванне ведаў), так і ў больш шырокім значэнні слова (як фарміраванне асобы чалавека).

У тэрмінах сінэргіі адукацыя ўяўляе сабой узаемапранікненне ў грамадстве двух адносна аўтаномных , але зліваючыхся ў рэшце рэшт працэсаў – лініі самарэгулявання – свядомага, намеранага, мэтарацыянальнага і мэтанакіраванага фарміравання падрастаючага пакалення (ад дзіцячага садка да

вну), і лініі спантаннага, стыхійнага, часам бессвядомага засвойвання індывідам у свеце штодзённасці разнастайных ведаў, духоўных і сацыяльных каштоўнасцяў ( у тым ліку і антыкаштоўнасцяў) і звычаяў.

У кожнага з памяненых складальнікаў адукацыйнай сінэргіі ёсць свае антыподы (так, у мэтарэгулюемай сферы могуць быць моманты адвольнага і выпадковага), а ў спантаннай паўсядзённасці дзейнічаюць жывыя рацыянальна мыслячыя індывіды і часта з актыўным мэтапалаганнем.

Можа падацца, што пералічаныя рэаліі соцыума ў іх "супрацоўніцтве" ствараюць стан нейкага хаоса, духоўнай дысіпатыўнасці і нявызначанасці. Між тым у пятым коле (духоўным) чалавечага быцця ўсе мае быць значна складаней. Тут назіраюцца ўзаемапранікненне, узаемаўплыў і ўзаемадзеянне рацыянальнасці, экзістэнцыяльнага і трансцэндэнтальнага, навацый і традыцый, стэрыятыпаў і адкрыццяў, інфармацыі і дэзінфармацыі, "асвечанага эгаізму" і "агульначалавечых" каштоўнасцяў, суб’ектыўнай інтэнцыянальнасці і вонкавага аб’ектывізму, свабоды і дэтэрмінацыі. У выніку ўсяго ў духоўным жыцці соцыума ствараецца нешта накшталт дысіпатыўнай сістэмы, якая ўтрымлівае і сябе рэальныя магчымасці з’яўлення агульных сінэргетычных эфектаў – хаоса і флуктуацый (плюралізм), біфуркацый (сацыяльны зварот, пераацэнка каштоўнасцяў), феномена атрактарнасці (харызма, ідэялогія). Асвета, адукацыя, такім чынам, гэта працэс, які разгортваецца ў сацыяльнай прасторы: а) мэтарацыянальных інтытуалізаваных камунікатыўна-ідэалагічных дзеянняў, якія здзейсняюцца сістэмай адукацыі (кіраванне дзеяннямі навучання і выхавання розных узроставых груп); б) у многім выпадковых, адвольных пазнавальных актаў індывідаў. У першым выпадку ўжываюцца дыдактычна арганізаваныя веды ў дашкольных установах, сярэдняй школе, вну, у постдыпломнай адукацыі. У другім выпадку працэс асветніцтва ўяўляе сабой пераважна стыхійнае ўспрыманне чалавекам інфармацыі – з СМІ, з мастацкай літаратуры, з камунікацый з іншымі людзьмі. Трэба меркаваць, што перш за ўсе ад каштоўнасных арыентацый і ўзроўня развіцця крытычнага мыслення індывіда залежыць змест таго, што застаецца ў яго галаве як вынік адукацыйнага працэсу.

## 2.4. Чалавек асвечаны

З многіх прыназоўнікаў да слова ”чалавек” (“разумны”, ”палітычны”, “туляючы” і г.д.) асаблівае значэнне для працуючых у галіне адукацыі людзей мае характарыстыка “асвечаны”. Гэта не проста навучаны чалавек, але менавіта той, які ўспрымае святло ведаў і сам у пэўным сэнсе яго выпраменьвае.

Які ж ён, сучасны чалавек асвечаны? Гэта, безумоўна, не «асвечаная машына» у духу поглядаў французскіх матэрыялістаў-метафізікаў XVIII ст. Гэта, далей, не проста адукаваны чалавек, валодаючы пэўнай сістэмай ведаў, але які не можа самастойна выпрацоўваць свае каштоўнасныя арыентацыі як

рэгулятывы ўласных сацыяльных дзеянняў. Гэта, нарэшце, не выключна кампетэнтны чалавек, здольны прафесіянальна рашаць спецыяльныя задачы, але бездапаможны ў асэнсаванні сінэргіі соцыума ў цэлым.

Шукаемую мадэль сучаснага «чалавека асвечанага» можна скласці з улікам як тэарэтычных уяўленняў аб ім як пэўным ідэальным тыпе, так і вынікаючых з самога паўсядзённага жыцця патрабаванняў. Гэта: а) комплекс ведаў, які абавязкова ўключае ў сябе разнастайныя звесткі з гуманітарнай сферы; б) пачуццё цікавасці, інтэлектуальная патрэба ва ўзбагачэнні свайго кагнітыўнага патэнцыялу; в) каштоўнасная ўстаноўка на набыццё новых ведаў; г) накіраванасць на пераадоленне антырацыянальных уяўленняў (невуцтва, агнастыцызму, скептыцызму, дагматызму, фанатызму і г.д.).

У святле сенняшніх рэалій сацыяльнага цвішэнізму асвечаны чалавек – гэта чалавек культурны, цывілізаваны, адукаваны, які супрацьстаіць цемрашалам, суперанімалам, сугестарам, людзям «масавым», «аднамерным», арыентуючымся на нейкі адзін бок абранага імі чалавечага існавання (спажыванне, поспех, моду і г.д.). «Чалавек асвечаны» – гэта і не «адукаванец» тыпа цыніка ці рамантыка былых часоў, свядома абраўшых шлях маргіналаў. У норме гэта той, хто здольны аптымальным чынам выкарыстоўваць свае веды ў практычных дзеяннях з крытычным асэнсаваннем іх наступстваў.

У духоўнай сінэргіі сучаснага беларускага грамадства, як і ў другіх краінах на постсавецкай прасторы, існуюць фактары, якія абцяжарваюць і нават перашкаджаюць рэалізацыі высакародных мэтаў асветніцтва. Гэта абумоўлена, у першую чаргу, крызісам адукацыі. Нельга не пагадзіцца са сцвярджэннем, што «працэсы, звязаныя з пранікненнем у галіну адукацыі царквы, рынкавых адносін, зніжэннем яе статуса (канфесіяналізацыя, камерцыялізацыя, рэгіёналізацыя), не проста цягнуць айчынную школу назад, яны адкідаюць яе назад на цэлую эпоху» (Вопросы философии. 1999, № 3. с. 10). У нас канфесіяналізацыя, у прыватнасці, праяўляецца ў друку праз абвяшчэнне ідэалам хрысціянскіх маральных каштоўнастяў. Камерцыялізацыя – праз скасаванне ўсеагульнай абавязковай сярэдняй адукацыі і яе элітызацыю. Рэгіёналізацыя – у пошуках зручнай «нацыянальнай ідэі».

Крызіс сістэмы адукацыі павінен успрымацца на фоне і іншых негатыўных з'яў духоўнай сінэргіі. Так, намогамі mass media (і перш за ўсё тэлебачання) у соцыуме СНД ствараецца атмасфера, якая дэмаралізуе грамадства, дэрацыяналізуе мысленне, дэгуманізуе культуру і вядзе да ідыётызацыі значнай часткі грамадства.

Падобныя перашкоды асветніцтву, арыентаванага на ўзвышэнне чалавечай асобы, ёсць у той ці іншай ступені і ў Беларусі. І хаця яны не дамінуюць у айчыннай духоўнай сінэргіі, іх дэструктыўную небяспеку не трэба пераменшваць. І добра, што гэта ва ўсё большай ступені ўсведамляецца інтэлектуальнай элітай краіны, занепакоенай яе лёсам і перспектывамі развіцця. Гуманізацыя і гуманітарызацыя асветы інтэнсіфіцыруюцца ў апошнія часы ў

Библиотека БГУИР

інстытуалізаванай частцы духойнай сінэргіі – у школьнай і вышэйшай адукацыі. Разам з іншымі мерамі, якія прымаюцца ў краіне, гэта павінна паспрыяць фарміраванню чалавека асвечанага, арыентаванага ў практычных дзеяннях на вышэйшыя экзістэнцыянальна-этычныя каштоўнасці.

## 2.5. Асветніцтва як пераадоленне духоўнай абскурантызацыі грамадства

Як ужо адзначалася, выраз "духоўная сінэргія" ўжываецца ў розных сэнсах: у вузкім – як азначэнне ўзаемаўплыву некаторых формаў грамадскай свядомасці (напрыклад маралі, навукі і мастацтва – у І. Лапшына); у спецыяльным – як "супрацоўніцтва" Бога і чалавека ў сярэдневяковым мысленні; у шырокім – як працэс і вынік супярэчлівага адзінства мэтанакіраванасці і спантаннасці ў ментальным жыцці соцыума, у коле пятым нашага быцця. Сфера духоўнасці – асобы тып рэчаіснасці, дзе спецыфічным чынам узаемадзейнічаюць аб'ектыўная дэтэрмінацыя і суб'ектыўныя інтэнцыі, экзістэнцыялы і каштоўнасці, нормы і сваволле, рацыянальнасць і ірацыянальнасць, "асвечаны эгаізм" і агульначалавечыя ідэалы, псіхічныя з'явы і пастулаты ідэялогіі.

Гэта сфера ўзаемадапаўнення і супрацьборства, крытыкі і ўзаемаадкідання, сумненняў і веры, перакананняў і роспачы, логікі і падсвядомасці, ясных мэтаў і архетыпаў, любові і нянавісці, палітычных праграм і асобасных рашэнняў, філасофскіх поглядаў і эзатэрычных пошукаў, маральных імператываў і нігілізму. У такім ментальным хаосе індывідуальнай і грамадскай свядомасці ўсталёўваецца і ўзнаўляецца кантынуум рэалій, які азначаецца як духоўная сінэргія. Духоўная сінэргія – гэта ідэалагічна-камунікатыўная структура жыцця грамадства, сукупнасць пабуджэнняў да адэкватных паводзінаў індывіда ў соцыуме. Стымулюючая практычныя дзеянні ментальнасць сацыяльнага суб'екта праходзіць праз яго уласныя флуктуацыі, біфуркацыі, пастаяннае перажыванне пачуцця няўпэўненасці, схільнасці да ўнушэння і ўзнясення харызматычнага лідара ("атрактарнасць"). Калі выкарыстоўваць метадалагічны патэнцыял сінэргетычнай парадыгмы, можна істотна канкрэтызаваць сэнс вядомай формулы Маркса "грамадскае быццё вызначае грамадскую свядомасць".

Цікавасць даследчыкаў да феномена духоўнай сінэргіі асабліва ўзрастае ў перыяды сацыяльнага цвішэнізму, у часы індывідуальнай і грамадскай нестабільнасці і сацыякультурнага выбару. Менавіта тут з усей выбітнасцю выяўляюцца такія вызначальныя рысы сацыяльнай сінэргіі, як "супрацоўніцтва" метарацыянальнасці ў сацыяльных дзеяннях і стыхійнасці ў грамадскіх працэссах і падзеях. На свой лад яны выяўляюцца і ў галіне духоўнай сінэргіі.

Библиотека БГУИР

Як у свеце ў цэлым, так і перадусім у краінах постсавецкай прасторы адбываюцца трансфармацыйныя працэсы соцыядухоўнага кшталту. Пры ўсёй разнастайнасці і плюралізацыі духоўнага быцця чалавека і соцыума даволі відавочна ў грамадстве вызначаюцца дзве супрацьлеглыя камунікатыўна-ідэалагічныя лініі – імкненне да абскурантызму, ідыётызацыі чалавека і імкненне да гуманізацыі соцыума.

Ідыётызацыя чалавека (і, адпаведна, грамадства) – гэта пастаянна нарастаючы і наўмысна накіроўваемы працэс яго дэінтэлектуалізацыі, дэкультуралізацыі, дэсацыялізацыі, маральнай дэградацыі, узмацнення аноміі і нігілізму. Парадокс тут у тым, што на мяжы тысячагоддзяў на хвалі невычэрпнага патэнцыялу тэхнічнага прагрэсу чалавецтва сутыкаецца з рэальнай перспектывай свайго духоўнага здзічэння. Сімптомы гэтай духоўнай ідыётызацыі самыя разнастайныя: “замбіраванне” электарату сродкамі масавай інфармацыі, адмена абавязковай сярэдняй адукацыі, станаўленне “аднамернага” чалавека, з’яўленне “модульнага” і “гомутэрнага” чалавека, “карнавалізацыя” быцця, прапаганда містыцызму і прымітывізму, канфесіяналізацыя грамадскага жыцця, вестэрнізацыя і амерыканізацыя культуры, эрозія маралі, “постмадэрнізацыя” мастацтва і філасофіі. Безумоўна, у кожнога чалавека свой лёс, свой выбар і шлях у жыцці. Але ёсць тэндэнцыя. І яна адчуваецца дастаткова выразна: сінэргія суб’ектыўнай выпадковасці і аб’ектыўнага сваволля і ірацыянальнасці фарміруюць рэгрэсіўную дэтэрмінацыю сацыяльных зменаў, вядуць у гістарычны тупік і да дэградацыі чалавечай асобы.

Разам з тым у духоўнай сінэргіі выяўляюць сябе і пазітыўныя, станоўчыя вынікі, якія даюць падставы для аптымістычных прагнозаў пры ацэнцы перспектыў нашага быцця. Гэта лінія гуманізацыі соцыума і чалавека. Яна стыхійна вызначаецца ў грамадскіх адносінах і інтэракцыях людзей на працягу ўсёй гісторыі, замацоўваючыся ў нормах маралі, праве, культуры. Вядомыя і канцэптуальна замацаваныя версіі гуманізма – рамантычная, рэлігійная, прафанная, інтэгральная і інш. Але ў структуры сучаснай духоўнай сінэргіі не можа лічыцца нармальным дыскрэтны і спантанны зварот да ідэі гуманізму. Яе свядома і мэтанакіравана супрацьпастаўляюць небяспечным выклікам ідыётызацыі чалавека з боку цывілізацыі, тэхналогіі і наўмыснай злой волі кіруючых эліт. Можна згадаць таксама аб канцэпцыях глабальнага, сацыяльнага, рэальнага і іншых форм гуманізма. Да іх трэба далучыць і аўтарскую канцэпцыю канкрэтнага, практычна-дзейснага гуманізма. На фоне сучасных сацыяльных супярэчнасцяў, тэхналагічных крызісаў, духоўнай эрозіі, адсутнасці натхняючых ідэялаў менавіта гуманістычная ідэя можа зараз і ў перспектыве быць аб’ядноўваючай усіх мэтаю, а таксама арыентырам інстытуалізаваных сацыяльных дзеянняў. Гуманістычныя каштоўнасці павінны быць і ядром нацыянальнай ідэялогіі Беларусі. У гэтым бачыцца тая практычная мэта, на якую павінны арыентавацца школьная і універсітэцкая

Библиотека БГУИР

праявы адукацыйнай сінэргіі, уся сукупнасць камунікатыўна-ідэалагічных дзеянняў асветніцтва.

У дадзенай сувязі ўзнікае неабходнасць больш грунтоўна разгледзець некаторыя важныя для агульнай тэорыі сучаснага асветніцтва праблемы чалавеказнаўства.

## 2.6. Роля асветніцтва ў гуманізацыі грамадства

Найважнейшай задачай асветніцтва ў шырокім разуменні з'яўляецца арыентацыя пазнавальных і камунікатыўна-ідэалагічных дзеянняў па распаўсюджванню сучасных ведаў аб чалавеку, гуманнасці і гуманізму. Спакваля і неяк неўпрыкмет у нас згасае яшчэ нядаўняя эйфарыя вакол так званых "агульначалавечых каштоўнасцяў". Некаму ўжо падаюцца неактуальнымі і ў чымсьці нават небяспечнымі ўяўленні аб чалавеку як самадастатковым крытэрыі грамадскага прагрэсу. Пішуць аб тым, што неабходна пераадолець збытковую, занадта аптымістычную веру ў чалавека, якая не вытрымала выпрабавання гісторыяй, выйшаўшы з гуманістычнай традыцыі з яе пастулатам – чалавек – "мера ўсіх рэчаў".

Пры сучаснай канфрантацыі сацыяльнага быцця, усплёску тэрарызму, практыцы ўтаймавання няскораных з дапамогай ракетна-бомбавых удараў, нарастаючай бездухоўнасці і маральнай дэградацыі асоб і грамадстваў, ва ўмовах узмацнення выклікаў экалогіі, тэхналогіі і цывілізацыі праблема чалавека набывае новыя істотныя аспекты і вымярэнні. Запатрабавана больш глыбокае веданне прыроды чалавека; але ці значыць гэта, што гуманізм увогуле павінен быць зведзены да ўзроўню "забабона"? (Б.Бахеньскі). Мяркуем, што ў філасофіі чалавека трэба перагледзець не столькі яе аксіялогію, колькі ўдакладніць анталогію homo. У гэтай сувязі варта прыслухацца да парады аб "пранікненні філасофіі ў сферу "паміж", якая апісваецца праз іерархію духоўных дыспазіцый" (І. Ахиезер. // Вопросы философии. 1999, № 8, с.11). З пазіцыі антрапалагічнага цвішэнізму чалавек з'яўляецца супярэчлівай рэаліяй, якая праяўляе сябе ў сукупным мностве разнастайных "колаў" уласнага быцця.

Асноўныя з іх: кола касмічнае з чалавекам як матэрыяльным аб'ектам у яго антропа-касмалагічнай функцыі; біялагічнае кола – жыццё людзей з інтэнцыяй на выжыванне, харчаванне, узнаўленне, здароўе і г.д.; кола логіка-псіхалагічнае ўключае ў сябе такія абавязковыя для чалавека разумнага якасці , як пачуццевае ўспрыманне, стрэсы, інтэлект, эмоцыі, мысленне, самасвядомасць, інтарэсы, перавагі, чаканні і інш.; кола сацыяльнае з яго гістарычным плюралізмам грамадскіх адносін, сацыяльных дзеянняў, этнічных супольнасцяў; кола духоўна-асобаснае з яго светам індывідуальных і сацыяльных каштоўнасцяў, мэтаў, ідэалаў, вераванняў, светапоглядаў, правоў, свабод і абавязкаў. Інакш кажучы, чалавек - аб'ект касмічны, жывы арганізм, істота з асобай псіхікай, суб'ект сацыяльных дзеянняў, духоўная асоба. Тым

самым пры абмеркаванні пытання аб гуманізме нельга абстрагавацца ад гэтай космабіяпсіхасоцыадухоўнай людской субстанцыі.

Вядомы розныя канцэпцыі гуманізма: абстрактны, рэальны, натуралісцкі, прафанны, рэлігійны, рамантычны і інш. З улікам адзначанага антрапалагічнага цвішэнізму здаецца аптымальным у наш час прытрымлівацца канкрэтнага дзеясна-практычнага гуманізму, які ўключае ў свой рэальны сінкрэтызм асобную ідэю (тэорыю) чалавека, спецыфічныя адносіны і пачуцці, адпаведны маральны лад жыцця людзей на вартым іх годнасці ўзроўні матэрыяльнага дабрабыту і галоўнае – канкрэтныя, практычныя дзеянні ва ўсіх сферах жыцця грамадства з арыентацыяй на чалавека як мэту і найвышэйшую каштоўнасць. Так зразумелы гуманізм у яго глабальным пераламленні можа і павінен быць асновай стратэгіі выжывання чалавецтва перад тварам соцыятэхнічных крызісаў настаўшага стагоддзя. Практічны гуманізм у сваей рэальнай канкрэтыцы – гэта сучасная альтэрнатыва шукаемым дзяржаўным ідэям сацыяльнага, рэлігійнага і іншых тыпаў.

Калі гаворкі пра гуманізм змяняюцца справамі, размова ўжо ідзе аб гуманізацыі соцыума і самога чалавека. З Усходу прыйшла да нас старажытная мудрасць: “бойся думкі – яна пачатак учынку”. Дык вось – хай думкі і пачуцці будуць такімі, каб яны ініцыявалі гуманныя дзеянні. Гуманнасць, зразумела, не зводзіцца на гуманітарную дапамогу ці заклікі да адмены смяротнага пакарання (і наогул, што значыць гуманнасць у адносінах да забойцаў, тэрарыстаў, гвалтаўнікоў?). Жыццё паказвае, што гуманнасць даецца разам з далучэннем да “цывілізацыі”. Таму трэба мэтанакіравана выхоўваць і развіваць у індывіда і ў грамадстве пачуцці і ідэі “узнёслай экзістэнцыі”: спачування, павагі, салідарнасці, годнасці, цярпімасці, погляду на чалавека як істоту свабодную, творчую, маючую правы.

Па ўсіх гэтых напрамках пажадана з маленства і на працягу ўсяго жыцця фарміраваць у сябе якасці гуманнага чалавека, які толькі і можа супрацьстаяць пагрозам фундаменталізму, таталітарызму, экстрэмізму, абскурантызму. Садзейнічаць гуманістычнаму асветніцтву ў выпрацоўцы неабходных для чалавека сучасных каштоўнасных арыентацый прызначана гуманістыка як сістэма ведаў аб жыцці і вышэйшых каштоўнасцях чалавека, ягоных сацыяльных дзеяннях і адносінах з другімі людзьмі, з прыродай, грамадствам і дзяржавай, сістэма ведаў, якая садзейнічае выпрацоўцы ў навучэнцаў дзеясна-практычнага гуманізма.

У Рэспубліцы Беларусь гуманістыка фарміруецца перш за ўсё як інтэгратыўная вучэбная дысцыпліна, якая абапіраецца на дасягненні ў пазнанні чалавека ў галіне філасофіі, антрапалогіі, псіхалогіі, культуралогіі, эканомікі, рэлігіязнаўства, медыцыны, этнаграфіі, паліталогіі, прыродазнаўства, права, аксіялогіі, гісторыі, лінгвістыкі, герменэўтыкі і інш. У 1999-2000 навучальным годзе ва ўсіх сярэдніх школах Рэспублікі Беларусь замест прадмета “Чалавек і грамадства” ўведзены курс гуманістыкі. Яго афіцыйная назва – “Чалавек.

Грамадства. Дзяржава.” Але ягоны змест і пакласнае разгортванне ўключае разнастайныя веды аб чалавеку. Так, у VIII класе вывучаецца раздзел “Мой свет”, у IX – “Свет людзей”, у X – “Свет сацыяльнага дзеяння”, у XI – “Чалавек у свеце культуры”.

Хацелася б спадзявацца, што гуманістычна арыентаваныя тэхналогіі будуць ва ўсё большай ступені запатрабаваны грамадствам.

Библиотека БГУИР

# 3. Адукацыя ў кантэксце соцыякультурнай дынамікі

## 3.1 Феномен адукацыі

Культурныя з’явы і працэсы вельмі разнастайныя і часта рознанакіраваныя. Але ёсць кропка, у якой яны абавязкова сыходзяцца. Гэтая кропка – чалавек, яго свядомасць, душа, унутранны свет. Асімілюючы каштоўнасці культуры – веды, нормы, спосабы дзеянняў – індывід уключаецца ў грамадскія адносіны і грамадскую практыку. Дадзены працэс прынята называць сацыялізацыяй. Найважнейшым яго механізмам з'яўляецца адукацыя.

У самым агульным значэнні слова “адукацыя” – гэта тыя спосабы і формы, праз якія людзі набываюць веды і разуменне свету, саміх сябе, навучаюцца прафесійнаму майстэрству і жыцці ў грамадстве. Сутнасць адукацыі раскрываецца праз ягоныя функцыі. Асноўныя сярод іх наступныя:

1) трансляцыя соцыякультурнага вопыту ад аднаго пакалення да другога;
2) развіццё чалавека як асобы і сацыяльнага дзеяча;
3) падрыхтоўка індывіда да канкрэтнага віда грамадска карыснай працы.

Адзначым, што ў рэальнай агульнаадукацыйнай практыцы пералічаныя функцыі здзяйсняюцца не паасобку,а ўзаемадапаўняюць адна адну. Гэта азначае, што ўсялякая адукацыя ёсць адначасова і абучэнне, і выхаванне.

Навучанне рэалізуе інструментальную, практычную інтэнцыю адукацыі і вызначаецца патрэбамі грамадства, дзяржавы альбо карпарацыі (партый, канфесій, сацыяльных груп) ў падрыхтоўцы спецыялістаў адпаведных кваліфікацый. Мэты навучання дыктуюць выбар адэкватных сродкаў і метадаў іх дасягнення. Сродкі абучэння па меры развіцця грамадства пастаянна зменяюцца (так, сённяшнія сродкі падрыхтоўкі, скажам, архітэктараў ці ваеннаслужачых карэнным чынам адрозніваюцца ад тых, якія выкарыстоўваліся 200 альбо 500 гадоў таму). А вось метады навучання застаюцца, па сутнасці, пастаяннымі. Усю існуючую іх разнастайнасць можна звесці да двух асноўных тыпаў:

1) якія арыентуюць навучэнцаў на запамінанне і ўзнаўленне гатовых ведаў і адпаведных узораў дзеянняў;
2) якія арыентуюць на самастойны пошук, вырашэнне праблем, адкрыццё новага.

Акцэнт на той ці іншай методыцы навучання залежыць ад мноства пераменных – як аб’ектыўных, так і суб’ектыўных. Але ж вызначальнымі сярод іх з’яўляюцца характар і механізм дынамікі канкрэтнага грамадства.

Такім чынам, галоўная задача навучання – падрыхтоўка чалавека умелага (homo faber).

Выхаванне рэалізуе культурную, грамадзянскую інтэнцыю адукацыі і вызначаецца светапоглядам грамадства, яго стаўленнем да традыцый і інавацый, патрэбамі людзей у паразуменні і камунікацыі. Выхаванне ў адрозненне ад навучання накіравана не столькі на развіццё інтэлекта і

Библиотека БГУИР

авалоданне прафесійнымі навыкамі, колькі на фарміраванне маральных якасцяў індывіда, яго эстэтычных патрэб і густаў, грамадзянскай пазіцыі, уменне жыць сярод людзей. Зразумела, што ў гэтым працэсе таксама істотны і канкрэтныя веды, і пэўныя метады. Але вызначальнымі ўсё ж фактарамі з'яўляюцца пануючыя ў грамадскай свядомасці каштоўнасці і дыспазіцыі. Рознымі спосабамі (раней гэта былі сям'я, традыцыі, аўтарытэт асобы настаўніка, сення – сродкі mass media, TV, рэклама, школа) яны пераводзяцца на ўзровень індывідуальнай свядомасці і вызначаюць стаўленне чалавека да другіх людзей.

Навучанне і выхаванне – гэта, па сутнасці, два бакі аднаго медаля. І калі часам выява на адным з іх пачынае сціpацца, то гэта ўяўная адзнака нейкай дысгармоніі ў адукацыйным працэсе. А паколькі адукацыя тысячай і адной ніццю звязана з усімі бакамі жыцця грамадства, такога кшталту разлад сведчыць і аб крызісе грамадскіх ідэалаў і каштоўнасцяў.

Існуюць два асноўных спосабы адукацыі: інстытуалізаваны і неінстытуалізаваны. Першы тып адукацыі здзяйсняецца праз школу, г. зн. спецыялізаваны сацыяльны інстытут. Гэты інстытут мае афіцыйны статус, рэгламентаваныя накірункі і нормы педагагічнай дзейнасці, пастаянны штат выкладчыкаў, фіксаваныя формы кантролю паспяховасці вучняў, выдае выпускнікам пасведчанні аб заканчэнні навучальнай установы і г. д.

Сучасная сістэма адукацыі як сацыяльны інстытут ахоплівае базавую і сярэднюю школу, прафесійна-тэхнічныя вучэбныя ўстановы, падсістэму вышэйшай адукацыі, а таксама постдыпломную адукацыю, якая ўключае ў сябе курсы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі. Разам з агульнай адукацыяй, неабходнай кожнаму чалавеку як члену дадзенага грамадства і носьбіту пэўнай культуры, яна дае маладым людзям і спецыяльную адукацыю, якая выступае перадумовай паспяховай прафесійнай дзейнасці і кар'еры.

Вылучаюць тры віды інстытуалізаванай адукацыі: дзённы (асноўны), вячэрні (вучоба сумяшчаецца з працай) і завочны (карэспандэнцкі). Гэтыя віды з'яўляюцца агульнымі як для дзяржаўных, так і прыватных, канфесійных і г. д. навучальных устаноў.

Да неінстытуалізаванага спосаба адукацыі адносяцца: сямейная адукацыя, якая атрымліваецца з штодзеннага жыццёвага вопыту і камунікацый; адукацыя, крыніцай якой з'яўляюцца сродкі mass media; самаадукацыя, якая звязана з канкрэтнымі інтарэсамі асобы і рэалізуецца па самых розных накірунках (ад чытання кніг і наведвання тэатраў да вандраванняў і экстрэмальных самавыпрабаванняў).

Адукацыя, такім чынам, гэта складаны шматгранны соцыякультурны і асобісты (трэба было б разам) феномен. Вобразна можна сказаць так: гэта своеасаблівая лінза, якая збірае (па)токі культуры і факусуе іх. Індывід, трапляючы ў гэты фокус, набывае развіццё як асоба, як сацыяльны дзеяч і як homo faber (прафесіянал). Правільна і зваротнае: стаўшы майстрам, настаўнікам, ён (ужо праз другіх – вучняў і паслядоўцаў) уплывае на развіццё

Библиотека БГУИР

грамадства і культуры. Зразумела, што ў кожнага чалавека свая столь і свой патэнцыял уздзеяння. І таму трэба *ўмець* ставіць перад сабой і дасягаць складаныя, узвышаныя і высакародныя мэты.

### 3.2. З гісторыі адукацыі

Адукацыя з'яўляецца гістарычным развіваючымся феноменам. Гэта азначае, что з цягам часу зменяюцца арганізацыйныя формы адукацыі, яе змест, сродкі, мэты, сувязь з практыкай. Важна разумець тэндэнцыі і заканамернасці дадзенага працэсу, бо ад таго, наколькі карэктна сфакусавана адукацыя на рэальныя патрэбы (эканамічныя, сацыяльныя, палітычныя, культурныя) развіцця грамадства, настолькі поўна яна зможа гэтыя патрэбы задаволіць.

Адным з асноўных метадалагічных рэгулятываў вывучэння складаных сацыяльных з'яў выступае прынцып адзінства гістарычнага і лагічнага аналізу. Выкарыстоўваючы яго, можна асочыць як галоўныя этапы развіцця адукацыі, так і вызначыць вузлавыя моманты гэтага працэсу, што, у сваю чаргу, можа дапамагчы разуменню праблем сучаснай адукацыйнай сінэргіі і сфармуліраваць яе прыярытэты на будучыню.

Адукацыя як інструмент сацыялізацыі індывіда ўзнікае разам са з'яўленнем соцыума. Першапачаткова яна рэалізоўвалася праз вербальную камунікацыю людзей, імітацыю ("рабі, як я"), рытуальныя дзеянні. Вынікам было авалоданне чалавекам наяўнай культуры дадзенай супольнасці. А пасля праходжання абраду ініцыяцыі (г. зн. пасвячэння) ён рабіўся поўнапраўным членам групы, племені, абшчыны.

Наступны крок у развіцці адукацыі звязаны з вынаходствам пісьменства (каля 3500 гадоў таму). Гэтая падзея паклала пачатак вядомай з тых часоў школьнай адукацыі. Іншымі словамі, адукацыя набыла характар фармалізаванай працэдуры і ператварылася ў сацыяльны інстытут. Першапачаткова настаўнікамі былі храмавыя святары, а навучэнцамі – выхадцы з вышэйшых сацыяльных слаёў. Навучанне у Егіпце і Шумеры доўжылася ад 5 да 17 гадоў і палягала ў набыцці навыкаў пісьменства (піктаграфія і іерагліфіка) і ліку. Прайшоўшыя курсы навучання ўтваралі асобны клас – пісцоў і займалі пачэснае месца у сацыяльнай іерархіі тагачаснага грамадства.

Паміж 1500 і 1000 г. да н.э. быў вынайдзены алфавіт, што зрабіла працэс навучання намнога лягчэйшым і эфектыўным. Але самы вялікі прагрэс у справе адукацыі здзейснілі антычныя грэкі. Дастаткова сказаць, што сённяшняя заходняя адукацыя ў многім абапіраецца на грэчаскую мадэль.

Галоўная мэта антычнай адукацыі – фарміраванне добрага грамадзяніна поліса (Старажытная Грэцыя, нагадаем, не была адзінай дзяржавай, а ўяўляла своеасаблівы архіпелаг незалежных гарадоў-дзяржаў, важнейшым сярод якіх былі Афіны). Навучанне пачыналася з 6 гадоў і ўключала ў сябе пісьменства,

Библиотека БГУИР

матэматыку, музыку, танцы, літаратуру і гімнастыку, а заканчвалася ў 15 гадоў. З 15 да 20 гадоў маладыя людзі вучыліся у курыруемых дзяржавай гімназіумах. Разам з фізічнай падрыхтоўкай (барацьба, бег), вайсковай справай вывучаліся філасофія і рыторыка. Філасофія складалася з логікі, матэматыкі, этыкі і прыродазнаўства. Рыторыка ўключала ў сябе курсы дзяржаўнага кіраўніцтва, гісторыі, красамоўя.

З імёнамі Платона і Арыстоцеля звязана ўзнікненне такіх вышэйшых навучальных устаноў, як акадэмія і ліцэй (лікей). Варта, аднак, адзначыць, што ў Грэцыі, падобна краінам старажытнага Усходу, адукацыйныя цэнтры часта з'яўляліся і чымсьці накшталт мужчынскіх рэлігійных брацтваў. Гэта рабіла іх, як мы зараз сказалі б, не зусім дэмакратычнымі. Была свая спецыфіка і ў атрыманні спецыялізаванай адукацыі. Прыкладам, медыцына развівалася ва ўлонні вузкага кола сем'яў, аб'яднаных у тайныя паўрэлігійныя адукацыйныя супольніцтвы.

Рымская сістэма адукацыі грунтавалася на падвалінах грэчаскай. Але у адрозненне ад грэкаў рымляне давалі школьную адукацыю і дзяўчынкам. У вышэйшых навучальных установах маладыя людзі з заможных сем'яў засвойвалі такія навукі, як права, гісторыю, мастацтва дзяржаўнага кіравання. Апрача таго, рымляне, якія былі людзьмі больш прагматычнымі, чым грэкі, надавалі вялікую ўвагу вывучэнню сельскагаспадарчых і інжынерных дысцыплін. Да 200 г. н.э. рымская культура і стандарты адукацыі шырока распаўсюдзіліся па ўсім заходнім свеце.

У часы сярэднявечча тэмпература інтэлектуальнага жыцця ў Еўропе ўпала амаль да нуля. Адзінымі ачагамі асветы, а, значыць, і адукацыі, былі кляштары. Менавіта манахам з ордэна св. Бенедыкта належыць адна цяжка пераацанімая гістарычная заслуга на ніве адукацыі. Вядома, што рабаўладальніцкі лад занепаў у тым ліку і з прычыны поўнага адчужэння разумовай працы ад фізічнай, навуковых ведаў ад практыкі. Дык вось, бенедыктынцы рашуча пераадолелі гэты разрыў, і ў працэсах паслушэнства сінэргічна спалучалі фізічную і духоўную працу. У наступныя часы з гэтага семені вырасла цывілізацыя новага тыпу – тэхнагенная. У яе падмурку – арыентацыя на сістэматычнае ўкараненне ведаў у вытворчасць, практыку, жыццё. Але напачатку гэтага шляху былі манахі.

На перыяд сталага сярэднявечча прыпадае яшчэ адно выбітнае вынаходніцтва эпохі – універсітэты. Першыя з іх з'явіліся ў гарадах Італіі, потым у Англіі і Францыі (у пачатку-сярэдзіне XII ст.) На працягу стагоддзяў прызнаным цэнтрам інтэлектуальнага жыцця Еўропы лічыўся Парыжскі універсітэт – знакамітая Сарбона. Да 1500 г. у Еўропе было ўжо каля 80 універсітэтаў. У іх атрымлівалі адукацыю і выхадцы з ВКЛ, у т.л. М. Гусоўскі, Ф. Скарына, Л. Сапега і інш. У 1579 г. у Вільні адкрылася першая ва ўсходняй Еўропе вышэйшая навучальная ўстанова (з 1803 г. – Віленскі універсітэт).

Библиотека БГУИР

Асноўнымі прадметамі вывучэння ў еўрапейскіх універсітэтах былі тэалогія, філасофія, права, медыцына, матэматыка. Галоўная мэта універсітэцкай адукацыі таго часу бачылася у падрыхтоўцы добрага, богабаязнага хрысціяніна, які разам з тым з'яўляўся і знаўцам свецкіх навук.

У эпоху Рэнесанса мэта адукацыі пачынае трансфармавацца. Цяпер на павестцы дня – навучанне і выхаванне ўсебакова развітых, культурных грамадзян. Актыўна адраджаюцца грэчаскія гімназіумы ў якасці ўзораў навучальных устаноў. З цягам часу яны развіліся ў сярэднюю школу, атрымаўшы ў кожнай краіне сваё найменне (гімназія – у Германіі, ліцэй і каледж – у Францыі, граматычная школа – у Англіі). Выхадцы з ніжэйшых класаў наведвалі пачатковую школу, а абітурыентамі універсітэтаў ад тае пары маглі быць выпускнікі толькі сярэдніх школ.

Вялікі ўклад у распаўсюджванне ўсеагульнай пісьменнасці быў зроблены пратэстантамі. Сутнасць яго ў тым, што, адкінуўшы аўтарытэт царквы ў якасці пасрэдніка паміж Богам і чалавекам, пратэстанты абвясцілі Біблію адзінай крыніцай слова Боскага. А дзеля таго, каб зрабіць яго даступным для вернікаў, пісанне было перакладзена на нацыянальныя мовы. (Нагадаем, што пераклад Бібліі Ф. Скарынам – другі ў свеце апасля чэшскага.) Далучэнне да граматы і адукацыі простых людзей азначала, што на гістарычную арэну выходзяць мільёны. Лёс заходняй цывілізацыі ва ўсё большай ступені пачынае залежыць ад іх ведаў, уменняў і дзеянняў.

Наступны, можа быць, самы істотны этап у развіцці сістэмы адукацыі прыходзіцца на Новы час і эпоху Асветніцтва. Ён звязаны з пераўтварэннем навукі (перад усім – прыродазнаўства) ў асноўную і самастойную пазнавальную сілу заходняй культуры. Еўрапейскія універсітэты на той час пачалі адставаць ад патрэб сацыяльнай практыкі (гэта, нагадаем, быў век прамысловага перавароту, дэмакратызацыі грамадскіх адносін, вялікіх навуковых адкрыццяў). Вось чаму ўзнікаюць новыя тыпы вучэбных устаноў – вышэйшыя інжэнерныя, гандлёвыя, ваенныя, тэхнічныя, сельскагаспадарчыя школы. Мэтаю адукацыі становіцца падрыхтоўка прафесіяналаў, гэта значыць, высокакваліфікаваных кадраў для растучай індустрыяльнай цывілізацыі. Безумоўнымі лідэрамі у гэтай справе былі Францыя і ЗША, затым, у XIX ст., іх сталі хутка наганяць Германія і Расія.

Сур'ёзная ўвага развіццю адукацыі надавалася ў Рэчы Паспалітай. У 1774 г. там была заснавана Адукацыйная камісія – першы ў Еўропе аналаг міністэрства адукацыі. Яна распачала фундаментальную рэформу адукацыйнай сістэмы – з праграмы навучання скасоўваецца тэалогія, уціск робіцца на прадметы фізіка-матэматычнага цыклу, адкрываюцца дзесяткі новых школ. У 1778 г. у Гародні засноўваецца медыцынская акадэмія, разбіваецца батанічны сад. У 1794 г., у сувязі з падзелам Рэчы Паспалітай, дзейнасць камісіі спыняецца. Аднак дадзены ёю моцны імпульс працягвае дзейнічаць, і ў 1848 г. адкрываецца земляробчы інстытут у Горы-Горках. У другой палове века, аднак, у сувязі з

Бібліятэка БГУІР

палітыкай царскага ўраду ў дачыненні да Паўночна-Заходняга краю, удзелам выкладчыкаў і студэнтаў ў нацыянальных паўстаннях, усе вышэйшыя навучальныя ўстановы на тэрыторыі Беларусі былі зачынены. Больш таго: напрыканцы стагоддзя толькі тры працэнты насельніцтва краю маглі чытаць і пісаць.

А ў Еўропе ў гэты час была ўведзена бясплатная пачатковая адукацыя. Царква губляе кантроль над навучаннем і выхаваннем, але не без супраціўлення. Дастаткова ўзгадаць знакаміты "малпавы працэс" у Амерыцы. Адукацыя дэмакратызуецца, узнікаюць спецыяльныя навучальныя ўстановы для жанчын. Рашуча да патрэб практыкі паварочваюцца універсітэты. Змест адукацыі ва ўсё большай ступені вызначаецца навуковым светапоглядам і навуковымі ведамі з акцэнтаваннем магчымасцяў іх практычнага ўжывання.

Аналіз асноўных этапаў эвалюцыі адукацыі паказвае, што яе мэты, змест, арганізацыйныя формы ў істотнай меры залежаць ад каштоўнасна-сэнсавых арыентацый грамадства, патрэб эканамічнага развіцця, уплыву пануючага тыпу светапогляду (рэлігіі ці навукі), ступені дэмакратызацыі соцыума. Заканамернасці развіцця адукацыі выказваюць сябе праз такія тэндэнцыі, як дэсакралізацыя, нарастанне сувязі з практыкай, дыверсіфікацыя, многаўзроўневасць, адкрытасць, даступнасць.

У ХХ ст. азначаныя тэндэнцыі працягвалі набіраць сілу. Яшчэ больш узмацнілася навуковая аснова адукацыі і перш за ўсё яго навукова-тэхнічная кампанента. У індустрыяльна развітых краінах (за выключэннем Англіі і ЗША) значна ўзрос дзяржаўны кантроль над зместам і якасцю абучэння і выхавання. У рашучай ступені гэта было звязана з хваляй мілітарызму і ідэалагічнай барацьбы, узнятай супрацьстаяннем таталітарных рэжымаў і сіл дэмакратыі.

У Савецкім Саюзе сістэма адукацыі была цалкам падпарадкавана мэтам і інтарэсам дзяржаўнай палітыкі і ідэалогіі. Гэта мела дваістыя наступствы. З аднаго боку, цэнтралізаванае планаванне і кантроль за развіццём адукацыі дало магчымасць за некалькі дзесяцігоддзяў ператварыць раней адсталыя і малаадукаваныя акраіны (адной з якіх была і Беларусь) у рэгіёны з сучаснай адукацыйнай інфраструктурай і высокім узроўнем пісьменства і прафесійнага майстэрства насельніцтва. З другога – арыентацыя адукацыі на патрэбы ваенна-прамысловага комплексу і ідэалы утапічнай ідэалогіі пастулова ўводзілі сістэму навучання і выхавання ад рэальных патрэб развіцця грамадства і асобы. У выніку, пасля распаду СССР, перад новымі незалежнымі дзяржавамі паўстала патрэба сур'ёзнага рэфармавання нацыянальных сістэм адукацыі.

### 3.3. Праблемы і перспектывы развіцця адукацыі ў ХХІ ст.

Актыўны пошук новых мэтаў, форм, арганізацыйных структур і тэхналогій абучэння ў краінах СНД ідзе ў кантэксце аналагічных намаганняў у сучасных развітых дзяржавах. Сутнасць праблемы ў тым, што на парозе ХХІ

Библиотека БГУИР

стагоддзя чалавецтва ўступіла ў перыяд кардынальнай трансфарамацыі падвалін свайго існавання, трансфармацыі, абумоўленай пераходам ад індустрыяльнага грамадства да постіндустрыяльнага, ад пісьмовай культуры да камп'ютэрна-інфармацыйнай.

Існуючая мадэль адукацыі пачынае адставаць ад патрэб жыцця. Яна арыентуе навучэнцаў на засваенне гатовых ведаў, склаўшыхся ўзораў дзейнасці і пры гэтым зыходзіць з таго, што аднойчы атрыманай адукацыі павінна хапіць чалавеку на ўвесь перыяд ягонай працоўнай біяграфіі. У сітуацыі адносна павольных сацыяльна-эканамічных і прамыслова-тэхнічных змен такі падыход меў рацыю. Зараз становішча іншае. Лавінападобна расце аб'ём інфармацыі. З'яўляюцца ўсё новыя і новыя навуковыя дысцыпліны. Сёння іх налічваецца амаль 15 тысяч. Арыентавацца ў гэтым інфармацыйным патоку старымі спосабамі ўжо немагчыма.

Набіраючая тэмпы і размах інфармацыйна-камп'ютэрная рэвалюцыя матэрыялізуецца ў хутка абнаўляемых тэхніцы і тэхналогіях, вытворчасці, кіраванні, сэрвісе, справаводстве і іншых сферах. Гэта, у сваю чаргу, вылучае новыя патрабаванні да ведаў і ўменняў працаўнікоў. Так, заходнія сацыёлагі падлічылі, что сучасны інжэнер за час сваёй прафесійнай кар'еры павінен перавучвацца восем разоў. У ЗША за апошнія 20 год абнавілася амаль палова ўсіх наяўных спецыяльнасцяў. Аналагічныя працэсы ідуць і ў нас. У Рэспубліцы Беларусь за апошнія пяць год зніклі з-за непатрэбнасці больш за 500 прафесій і з'явіліся каля 200 новых.

Роля сістэмы адукацыі ў адбываючыхся змяненнях не проста важкая, яна робіцца ўсё больш і больш вызначальнай. Так, праграмы развіцця адукацыі ў вядучых краінах свету накіраваны на ўвядзенне першай ступені ўсеагульнай вышэйшай адукацыі. Невыпадкова таму, што артыкулы выдаткаў на адукацыю "там" з'яўляюцца найбольш прыярытэтнымі. У нашай рэспубліцы выдаткі кансалідаванага бюджэта на адукацыю ў 2000 г. склалі 565 987 млрд. рублёў, што пакуль далёка ад рэальных патрэб, але тым не менш дазваляе падтрымліваць яе на неабходным узроўні і праводзіць рэформы. Рэфармаванне сістэмы адукацыі – працэс складаны, шматгранны і доўгачасовы. Першы крок у гэтым накірунку – распрацоўка новай мадэлі (парадыгмы) навучання і выхавання. Гэтая парадыгма павінна даць адказ на галоўнае пытанне: які тып асобы, чалавека патрэбны сучаснаму грамадству? Каго павінна рыхтаваць сістэма адукацыі?

Кожная эпоха ставіць перад адукацыяй свае мэты. А мэты неадымны ад светапогляду часу, яго ўяўленняў аб свеце, чалавеку, яго месцы і прызначэнні ў ім. Сёння працягвае дамінаваць ідэя выхавання творчай асобы, скіраванай на прагрэс, інавацыі, дзеянні, якая самаздзяйсняе сябе праз падпарадкаванне наваколля сваёй волі. Але шматлікія крызісы XX ст. – экалагічны, дэмаграфічны, сацыяльны, духоўны – пабуджаюць паставіць пад сумненне сучасную стратэгію цывілізаванага развіцця, стратэгію на пакарэнне прыроды, змяненне свету, гвалтоўнае "ўдасканаленне" самога чалавека. Змяненне

Библиотека БГУИР

дадзенай стратэгіі перш за ўсё звязана з пераменамі ў светапоглядзе людзей. Адзін з магчымых шанцаў пралягае праз дыялог культур.

Новая мадэль адукацыі павінна ўлічваць не толькі заходні вопыт разумення свету, узаемадзеяння чалавека з навакольным асяроддзем, але і ўсходні – з яго ўяўленнем аб прыродзе як жывым арганізме, традыцыях як аснове маралі, ведах як перадумове гармоніі і раўнавагі. Асіміляючы на прынцыпах сінэргізма соцыякультурныя каштоўнасці розных цывілізацый, адукацыя якраз і можа паспрыяць разгортванню маштабнага дыялога культур і, такім чынам, выпрацоўцы новага светагляду, новых каштоўнасна-сэнсавых падвалін чалавечага існавання, новай стратэгіі развіцця постіндустрыяльнага грамадства.

Вось чаму, не гледзячы на тое, што светаглядныя праблемы могуць падацца для канкрэтнай навучальнай установы ці канкрэтнага навучэнца чымсьці далёкім і абстрактным, для сістэмы адукацыі як сферы "вытворчасці чалавека" яны прынцыпова важкія. Асабліва востра дадзеныя праблемы паўстаюць ў крызісныя, пераходныя моманты сацыяльнай дынамікі, як, прыкладам, зараз.

Калі, скажам, у грамадскай свядомасці няма яснасці адносна перспектыў, няма аб'ядноўваючых грамадства каштоўнасцяў, то ўзнікае пытанне: якога чалавека павінна гатаваць і выхоўваць школа? Проста прагматыка і прафесіянала? Але менавіта "проста прафесіяналы" і накіравалі цывілізацыйны працэс у тупік (ад экалагічнага крызісу да экалагічнага калапсу – паўкрока). Для выйсця з крызісу патрэбны новы тып чалавека – чалавек, арыентаваны ў сваіх думках і дзеяннях на дыялог, сінэргізм, узаемаразуменне, гармонію.

Менавіта таму ў дакладзе ЮНЕСКА "Адукацыя: схаваны скарб", адрасаванага ўрадам свету, вызначаюцца наступныя асноўныя мэты адукацыі: вучыць чалавека ведаць (learning to know); вучыць быць (learning to be); вучыць рабіць (learning to do); вучыць жыць разам (learning to live together). Адзінства гэтых мэтаў і ўтварае пажаданы ідэал мадэлі адукацыі XXI ст. Гаворка, такім чынам, ідзе аб узноўленні першапачатковага сэнсу адукацыі, якая, нагадаем, ёсць сінтэз навучання і выхавання. Устаноўка на падрыхтоўку інтэлектуала, прафесіянала, homo faber, дамінаваўшая ў XX ст., дапаўняецца ўстаноўкай на выхаванне чалавека культурнага, маральнага, адказнага.

Змяшчэнне прыярытэтаў у адукацыі дыктуецца таксама тымі сацыяльнымі зрухамі, якія адбываюцца ў сучасным свеце. Іх сутнасць – у імкненні краін і народаў да інтэграцыі, да аб'яднання намаганняў у будаўніцтве "агульнага дому". Такія працэсы ідуць у СНД, Еўропе, другіх рэгіёнах і ўключаюць у сябе як міждзяржаўнае супрацоўніцтва ў вырашэнні глабальных праблем (эканамічных, экалагічных, навукова-тэхнічных і г.д.), так і непасрэдныя камунікацыі людзей (турызм, бізнес, шлюб, праца за мяжой, іміграцыя і т.п.). Таму прававая, палітычная, гуманітарная культура асобы робіцца сёння важным фактарам яе сацыяльнай мабільнасці, здольнасці разумець другіх людзей, хутка і бязбольна ўжывацца, уваходзіць у чужую для

Библиотека БГУИР

яе жыццёвую прастору. Задача адукацыі ў гэтай сувязі – гатовіць чалавека да жыцця ў адкрытым, дынамічным грамадстве без межаў і забабонаў. Гэта патрабуе засвойвання навучэнцамі соцыякультурнага вопыту сваёй краіны ў кантэксце культуры, гісторыі і традыцый рэгіёна. Для нас – гэта перадусім духоўная і сацыяльная спадчына СНД і Еўропы.

Сцісла, але разам з тым ёміста прыярытэты сістэмы адукацыі ў святле ідучых інтэграцыйных працэсаў выкладзены ў пастанове семінара Савета Еўропы «Педагогіка культурнай спадчыны ў працэсе будаўніцтва цівільнага грамадства» ад 25.10.2000 г.:

– арыентацыя пазнавальнай і практычнай дзейнасці навучэнцаў на вывучэнне свайго прыродна-геаграфічнага, сацыяльнага і культурнага асяроддзя;
– развіццё крытычных здольнасцяў навучэнцаў у ацэнцы інфармацыі, уменне весці дыялог і выказваць памяркоўнасць у адносінах да мыслячых інакш;
– веданне сацыяльна-эканамічных заканамернасцяў развіцця грамадства для праектавання і рэалізацыі ўласнай культурна-адукацыйнай і прафесійнай будучыні;
– усведамленне каштоўнасцяў гістарычнай традыцыі ў сацыяльным і культурным кантэксте сучаснага жыцця.

Зразумела, напаўненне гэтых установак канкрэтным зместам адбываецца ў кожнай краіне, грамадстве з улікам іх уласных інтарэсаў.

Практычная рэалізацыя мэтаў і прыярытэтаў новай парадыгмы адукацыі неадымна ад методык і тэхналогій навучання. Дамінаваўшы ў папярэдняй адукацыйнай мадэлі інфармацыйна-навучальны метад быў скіраваны, як адзначалася вышэй, на засвойванне дасягнутага. Адукацыйны ідэал XXI ст. на першае месца высоўвае прынцып асобіста-развівальнага, апераджальнага навучання, што патрабуе развіцця ў вучняў патрэбы ў пастаяннай самаадукацыі, у працы на будучыню. Дадзены прынцып, вядома, мае сваю спецыфіку і формы рэалізацыі на розных узроўнях навучання – ад стымулявання і развіцця цікаўнасці і дапытлівасці ў дзяцей да навучальна-доследных практык (у тым ліку праз уключэнне студэнтаў у навуковую творчасць) у вышэйшай школе.

Адукацыйная мадэль XXI ст. – гэта дынамічная сістэма найбольш фундаментальных мэтаў, ідэй, прыярытэтаў і метадаў навучання і выхавання. Па меры развіцця грамадства яна будзе пастаянна ўдакладняцца і абнаўляцца. Ніводная краіна, калі яна не жадае выпасці з цывілізацыйнага працэсу, не можа не мадэрнізаваць сваю сістэму адукацыі без уліку імператываў фарміруючагася адукацыйнага ідэалу.

У кантэксце ўласных, звязаных з распадам СССР і разгледжаных вышэй агульных праблем набліжаючагася постындустрыяльнага грамадства, адбываецца рэфармаванне адукацыйнай сістэмы ў Рэспубліцы Беларусь. Сэнс

Библиотека БГУИР

рэфармавання – зрабіць яе адэкватнай патрэбам нацыянальнага развіцця і ідучых у СНД і Еўропе інтэграцыйных працэсаў.

Перабудова як грамадства ў цэлым, так і яго асобных падсістэм наўпрост звязана з выбарам тых прыярытэтаў, якія вызначае кіраўніцтва краіны. У Рэспубліцы Беларусь выбар зроблены на карысць павольнага, паэтапнага змянення сацыяльных структур і інстытутаў. Гэта зніжае сацыяльныя выдаткі рэформ (высокае беспрацоўе, сацыяльная напружанасць, раскол грамадства, вострая палітычная барацьба і г.д.),але разам з тым расцягвае працэс рэфармавання на няпэўны час. Наступствам з'яўляецца стагнацыя эканомікі, квёлае станаўленне новых форм уласнасці, цівільнага грамадства, нацыянальнай самасвядомасці. Для менталітэту большасці насельніцтва ўласцівы патэрналісцкія чаканні. У падмурку дзяржаўнай ідэалогіі няма адпаведнай апоры на нацыянальныя традыцыі, гісторыю і культуру, адсутнічае поўнамаштабны дыялог з Еўропай.

Усе гэтыя фактары ў істотнай ступені праблематызуюць задачы рэфармавання айчыннай адукацыі. Тым не меньш, нягледзячы на ўсе стаячыя перад грамадствам і дзяржавай складанасці, пераўтварэнні ў галіне адукацыі пачаліся. Ідзе актыўная перабудова арганізацыйных форм сістэмы, фарміруецца новая адукацыйная інфраструктура. Так, здейснена яе гарызантальная і вертыкальная дыверсіфікацыя (ад англ. diversify – рабіць разнастайным). Пашырана кола вну, факультэтаў, кафедр, з'явіліся новыя вучэбныя ўстановы, у тым ліку недзяржаўныя. Шэраг вну пераўтвораны ва ўніверсітэты, а ўніверсітэты набываюць трохузроўневую структуру, г. зн. ажыццяўляюць падрыхтоўку бакалаўраў, спецыялістаў і магістраў (БДУ, педагагічны універсітэт імя М.Танка, Мінскі лінгвістычны універсітэт).

Новым тыпам вышэйшай навучальнай установы з'яўляецца вышэйшы каледж. Тут можна атрымаць агульную сярэднюю адукацыю (пасля базавай), рабочую прафесію, сярэднюю спецыяльную адукацыю і вышэйшую. Прыкладам яшчэ больш інтэграванай адукацыйнай структуры, у якой рэалізавана ідэя бесперапыннай, адкрытай шматузроўневай адукацыі з'яўляецца РІПА (Рэспубліканскі інстытут прафесіянальнай адукацыі). Акрамя пералічаных ступеняў абучэння тут функцыяніруюць курсы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, а таксама аспірантура.

Мяняецца змест адукацыі ў сярэдніх спецыяльных вучэбных установах. Многія з іх пертвораны у каледжы. Новаўвядзенне ў тым, што іх праграмы навучання скаардынаваны з універсітэцкімі, што дазваляе выпускнікам паступаць у роднасныя вышэйшыя навучальныя ўстановы і заканчваць іх за больш кароткі тэрмін.

Зменьваецца і сярэдняя школа. Разам з традыцыйнымі школамі з'яўляюцца новыя – гімназіі і ліцэі. Іх адрознівае дыферэнцыраваны і паглыблены змест навучання.

Библиотека БГУИР

Прафесійна-тэхнічную адукацыю можна набыць у прафесійна-тэхнічных вучылішчах, цэнтрах прафесійнай адукацыі, вышэйшых прафесійных і тэхнічных вучылішчах.

Гэтыя пераўтварэнні датычацца і распрацоўкі новых праграм і стандартаў навучання, выдання новых пакаленняў падручнікаў і дапаможнікаў, пераабсталявання матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі і г.д.

Але ўсё гэта толькі першыя крокі ў патрэбным накірунку. Далейшы рух наперад звязаны з эфектыўнай мадэрнізацыей соцыума ў цэлым, яго эканамічных, палітычных, навуковых, культурных і іншых істытутаў, шырокім міжнародным супрацоўніцтвам у інтарэсах пабудовы агульнай сацыяльнай і культурнай прасторы.

Библиотека БГУИР

# 4. Тэарэтычныя асновы даследавання беларускага асветніцтва

## 4.1. Агульнае і адмысловае ў асветніцтве

Як адзначалася вышэй, феномен асветніцтва можна даследаваць з розных пунктаў гледжання. Прыкладам, як працэс паступовага ўсталявання рацыяналістычных уяўленняў і вынаходстваў у розных сферах сацыяльнай жыццядзейнасці. У яго падмурку – штодзённы практычны вопыт людзей, іх патрэбы ў найбольш эфектыўным прыстасаванні да выклікаў прыроднага і сацыяльна-гістарычнага асяроддзя. У гэтым сэнсе асветніцкія тэндэнцыі ўласцівы ўсім тыпам традыцыйных грамадстваў. Але яны маюць там свае межы, якія, між іншым, абумоўлены адсутнасцю ў іх духоўнай сінэргіі навукі як аўтаномнай пазнавальнай сілы.

У больш строгім сэнсе паняцце асветніцтва звязана з пэўнай ступенню развіцця еўрапейскай цывілізацыі і культуры. У яе падмурку ляжаць ідэалы навуковага рацыяналізма, гуманізма, свабоды асобы, вера ў гістарычны прагрэс, вяршэнства закона як галоўнага рэгулятара міжсуб’ектных adносінаў. У сваёй сукупнасці гэтыя каштоўнасці сталі асновай новаеўрапейскага гісторыка-культурнага праекта. Яго рэалізацыя ў сацыяльнай практыцы заходнееўрапейскіх і амерыканскага народаў прывяла да ўзнікнення новага тыпу грамадства. Яно вызначаецца скіраванасцю на тэхнагенную рынкавую вытворчасць, дэмакратычны палітычны рэжым, ліберalісцкую ідэалогію і практыку, дамінаванне навуковага светапогляду.

Такім чынам асветніцтва – гэта шырокі гістарычны працэс пераўтварэнняў у сацыяльнай і духоўнай сінэргіі грамадства, рухаючай сілай якога з’яўляюцца разняволеныя сілы ўнутранай дэтэрмінацыі асобы. Менавіта пад чалавека як асобу на працягу стагоддзяў ладзілася гаспадарчая арганізацыя, дзяржаўны лад і кіраванне заходняга грамадства, яго палітычная і прававая сістэмы, іерархія і ўзаемадзеянне сацыяльных структур і інстытутаў.

Неўзабаве ў кола пераўтварэнняў аказаліся ўцягнутымі і іншыя краіны і цывілізацыі свету. Аднак кожная з іх засвойвала ідэалы асветніцтва праз сваю ўласную культурную і гістарычную спадчыну, свае нацыянальныя інтарэсы і патрэбы. З цягам часу гэты працэс стаў рабіцца ўсё больш шматгранным і шматбаковым (праз узаемаўплывы тыпу Усход-Захад), узбагачаючы класічныя асветніцкія каштоўнасці новым зместам і формамі, пераасэнсаваннем былых утопій і ідэалогій.

Вось чаму усялякія канцэпцыі ці мадэлі нацыянальнага асветніцтва павінны будавацца на падвалінах рэальных тэндэнцый і інтэнцыях жыцця народа, яго гістарычнай спадчыне і не могуць абмяжоўвацца толькі культурна-выхаваўчымі ці адукацыйнымі праграмамі.

Библиотека БГУИР

Пасля гэтых беглых, але неабходных папярэдніх заўваг мы можам перайсці да абмеркавання праблем адметнасці беларускага асветніцтва, ягонага зместу і найбольш прымальных мадэляў развіцця на бліжэйшую перспектыву.

## 4.2. Тэарэтыка-метадалагічныя прынцыпы аналізу беларускага асветніцтва

Пабудова нацыянальнай асветніцкай мадэлі патрабуе комплекснага падыходу і павінна грунтавацца на прынцыпах гістарызму, сістэмным аналізе і метадалогіі сінэргетыкі. У больш разгорнутым выглядзе гэты метадалагічны фундамент уключае ў сябе аналіз, па-першае, нацыянальнай культурна-гістарычнай спадчыны; па другое, ступені далучэння і засваення ідэалаў заходнееўрапейскага асветніцтва беларускім грамадствам; па-трэцяе, даследаванне сучаснай беларускай сацыяльнай і духоўнай сінэргіі; па-чацьвёртае, эксплікацыю чыннікаў станаўлення чалавека ў гарызонце асобы; па-пятае, вызначэнне вырашальных фактараў сацыяльна-эканамічных, палітыка-прававых і культурных змен у беларускім грамадстве; па-шостае, разгляд пануючых ідэалагічных арыентыраў і існуючых навучальных праграм і г.д. Усе гэтыя пытанні датычацца карэнных, жыццёва важных патрэб і інтарэсаў беларускага народа. Кожны з гэтых прыпцыпаў можа быць (і з’яўляецца) прадметам самастойнага даследавання ў айчыннай навуковай і філасофскай літаратуры. З пункту гледжання мэтаў і задач дадзенай працы патрэбна такая катэгорыя, якая зводзіла, збірала б іх ў нейкі адзіны фокус. Такім фокусам, на наш погляд, з’яўляецца паняцце “нацыянальная ідэя”.

Адразу ж адзначым, што сэнс беларускай нацыянальнай ідэі не з’яўляецца чымсьці застылым, нейкай “рэччу-ў-сабе”, якую трэба проста знайсці – у тэкстах, дзеяннях, падзеях, фактах гісторыі, выказваннях розных асоб і г.д. Насупраць, гэты сэнс неабходна сканструяваць, бяручы пад увагу як усё тое, “што было” (даючы яму пэўнае тлумачэнне), так і тое, “што павінна быць” (і зноў пры адпаведнай інтэрпрэтацыі). Вось гэтая выніковая канцэптуальная канструкцыя і можа стаць стрыжнем нацыянальнай асветніцкай мадэлі.

## 4.3. Беларуская нацыянальная ідэя як стрыжань мадэлі беларускага асветніцтва

Карані беларускай нацыянальнай ідэі палягаюць у нашай гістарычнай спадчыне. Займаючы месца ў цэнтры Еўропы, Беларусь спытала мацнейшы ўплыў і ціск як з Усходу (Расія), так і з Захаду (Польшча), уваходзячы ў склад то адной, то другой дзяржавы. Нярэдка гэтыя ўздзеянні былі супрацьлеглымі. Прыгледзімся да іх больш пільна. Так, у фундаменце расійскага соцыякультурнага ўтварэння – свая культургенная матрыца, якая вызначае яго адмысловасць і забяспечвае ідэнтычнасць на ўсіх этапах гістарычнай эвалюцыі.

Библиотека БГУИР

Яна характарызуецца ўнутранай супярэчлівасцю каштоўнасных імператываў, прычым не столькі ў аспекце ўзаемадапаўнення супрацьлегласцяў, колькі ў плане іх узаемаадмаўлення: дэспатызм, гіпертрафія дзяржавы і анархізм, вольнасць; індывідуалізм, абвостраная самасвядомасць асобы і безасобасны калектывізм; эсхаталагічная месіянская рэлігійнасць і найвышэйшая набожнасць; абраднасць і шуканне праўды; рабства і бунт; богабоязь і ваяўнічы атэізм і г.д.

Гісторыя Расіі – гэта кружэнне ў коле гэтых супярэчнасцяў, з якога яна была выведзена воляю Пятра І. ХІХ ст. – час росквіту яе культуры, эмансіпацыі асобы і мыслення.

Ідэалы заходнееўрапейскага асветніцтва ўваходзілі ў расійскі менталітэт спакваля, апасродкавана, праз культурна-гістарычную традыцыю, барацьбу старога і новага (славянафілы і заходнікі, памяркоўнікі і радыкалы). 17-ты год прынёс перамогу палітычным радыкалам і гісторыя Расіі набыла савецкі сцэнарый развіцця. На парозе ХХІ ст. яна зноў, чарговы раз спрабуе вызначыцца ў сваіх каштоўнасных перавагах і сацыяльна-культурнай перспектыве.

Беларусь апынулася на стыку дзвюх вышэйпамянёных цывілізацый: Усходу і Захаду. Гэтая акалічнасць адыграла рашаючую, па сутнасці, драматычную ролю ў яе гістарычным лёсе. Абставіны апошніх стагоддзяў прывязалі нашу краіну да Расіі з усімі вынікаючымі адсюль наступствамі. Аднак не меньш моцны, а ў творча-стваральным плане, магчыма, і больш прадуктыўны пласт нашай культуры прыцягваецца да заходняга свету.

Дзесяцівяковы гістарычны вопыт беларускага народа сведчыць, што яго творчы патэнцыял у найбольшай ступені выявіўся падчас уласнай дзяржаўнасці і сышоў, калі палітычная свабода была страчана. Яшчэ ў тыя часы склаўся беларускі этнас, сфарміравалася мова, вызначыліся асаблівасці ментальнасці, былі закладзены тэарэтычныя асновы дзяржаўнага будаўніцтва (Статут ВКЛ), нарэшце, гэта быў зорны час айчыннай гуманістычнай культуры.

Дзяржава, мова, культура – гэта асноўныя чыннікі самаідэнтыфікацыі народа ў прасторы і часе. Яны з’яўляюцца тым унікальным гістарычным капіталам, у захоўванні і ўзбагачэнні якога палягае сэнс быцця кожнай нацыі. “Абавязак кожнай нацыі, – сцвярджае вялікі індыйскі пісьменнік-гуманіст Р.Тагор, – выказать сябе перад светам. Калі ж ёй няма чаго сказаць іншым, то гэта варта разглядаць як нацыянальнае злачынства, гэта горш, чым смерць і не даруецца чалавечай гісторыяй. Нацыя абавязана зрабіць агульным здабыткам тое лепшае, што ў яе ёсць”.

Наколькі поўна здолеў выказаць сябе перад светам беларускі народ? У ацэнцы яго намаганняў нельга не пагадзіцца з І.Абдзіраловічам, аўтарам аднаго з першых сацыяльна-філасофскіх даследаванняў беларускай ментальнасці, культуры і светапогляду. Ён пісаў: “Фармальна мы павінны згадзіцца , што ў нас неакрэсьлена культура, што ў нас смутныя гістарычныя шляхі, але ў гэтым ня можна бачыць духоўнай беднасьці нашага народу, яго няздольнасці ўласным

Бібліятэка БГУІР

крокам ісьці да вытварэння ўласных формаў жыцьця, – не, жыцьцёвыя акалічнасьці даводзяць аб іншым… Калі беларускі народ не стварыў выразнай культуры, дык гэта дзеля таго, што ў гістарычнай спадчыне яго была вялікая трагедыя народнага духу: Беларусь ад X веку і да гэтай пары фактычна з'яўляецца полем змаганьня двох кірункаў культуры… – заходняга і ўсходнягя". Завяршае ён свой аналіз наступным вывадам: "Векавое дасьвядчэньне кажа нам, што вольнага разьвіцьця нашага духу не запаўняе ні заходняя, ні ўсходняя культура, бо яны абяртаюцца ў формах гвалтоўнага, людаежнага мэсіянізму і розьніца між імі толькі ў назовах, лёзунгах, а іх аціскаючыя ланцугі – аднолькавы для нашага духу. Трэба шукаць на іншых шляхох". За пэўнымі папраўкамі на час гэтыя словы застаюцца актуальнымі і сёння.

Другі шлях – гэта шлях вольнай гістарычнай творчасці і самасцвярджэння. А пачынаецца ён з самапазнання, з вылучэння ідэй, якія могуць абудзіць і аб'яднаць народ. Духоўнае адраджэнне, духоўная сталасць – неабходная прадумова далейшых вызвольных дзеянняў. На мяжы XVIII-XIX ст.ст. гэты працэс ахапіў цэлы шэраг залежных і прыгнечаных сусветнымі імперыямі краін; закрануў ён і Беларусь.

Ля вытокаў беларускай нацыянальнай ідэі, асветніцтва, стаялі навукоўцы, выкладчыкі Віленскага універсітэту. Сістэматычныя і мэтанакіраваныя доследы па вывучэнні гісторыі, этнаграфіі і археалогіі ВКЛ падвялі іх да высновы аб своеасаблівасці беларускай культуры, неабходнасці яе адраджэння і развіцця.

Разам з тым гэта быў час узмацнення фізічнага і духоўнага прыгнёту ліцвінаў з боку царызму. У шэрагу губерняў Паўночна-Заходняга краю насельніцтва стаяла літаральна на мяжы вымірання. І.М. Захар'ін, успамінаючы аб службе ў Беларусі ў 1864-1870 гг. XIX ст. (т.зн. амаль праз сто год пасля далучэння "единокровных и единоверных братьев - белорусов" да Расіі) пісаў: "Крестьяне Минской губернии поражали меня своими болезненными испитыми лицами, малым ростом, белого сукна рубашками, в которые были одетыми. Избы их все курные, сырые; лошади их ростом не больше обыкновенных годовалых жеребят в наших внутренних губерниях… Недаром покойный Добролюбов заметил, что белорусы – совсем измельчавшая и забитая человеческая раса, мало похожая на обыкновенных людей" (Исторический вестник, 1884, № 3).

Ф.Багушэвіч, асэнсоўваючы стан беларускага людства таго часу, акцэнтаваў важнейшы тады аспект нашай нацыянальнай ідэі: "...каб ня ўмерлі". (Гэты аспект, заўважым у дужках, актуальны і сёння – колькасць насельніцтва краіны імкліва скарачаецца – за апошнія пяць год – на 300 000 чалавек, здаровых людзей робіцца ўсё меней…).

У такіх умовах гуманістычны патэнцыял беларускай ідэі ў XIX ст. разгортваўся перад усім праз дзейнасць інтэлігенцыі – як нацыянальнай, так і прагрэсіўнай расійскай і польскай. Прычым адбывалася гэта ва ўмовах

Библиотека БГУИР

жорсткай антыбеларускай палітыкі самаўладдзя, ва ўмовах, калі афіцыйна была забаронена беларуская пісьмовая мова, калі краіна была нават пазбаўлена гістарычнай назвы.

Тым не меньш у гэты перыяд нацыянальная ідэя ўзбагачаецца і новым зместам. Так, калі напачатку яна звязвалася з культурна-асветніцкай дзейнасцю, то ў свядомасці інтэлігенцыі другой паловы XIX ст. яна стала атаясамляцца з ідэяй палітычнай свабоды, незалежнасці краю. Яе кульмінацыйным выражэннем з’явілася паўстанне пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага.

Пасля падаўлення паўстання назіраецца перыяд часовага зацішша, выкліканага перш за ўсё знішчэннем соцен удзельнікаў вызвольнага руху, найбольш свядомых носьбітаў ідэі свабоды. Аднак ужо на пачатку XX ст. пачынаецца новы ўздым нацыянальнай свядомасці. Каласальную ролю ў гэтым працэссе адыграла агульнабеларуская газета “Наша ніва”, дзякуючы якой ідэалогія нацыянальнага асветніцтва стала даходзіць да самых шырокіх колаў насельніцтва. Сімвалам сталасці растучага самавызначэння нацыянальнага духу з’явілася ўзнікненне класічнай беларускай літаратуры. Нядзіўна, што менавіта пісьменнік Я. Купала так выразна і дакладна сфармуляваў сутнасць нашай нацыянальнай ідэі тае пары – “людзьмі звацца”. Інтэлектуальнае і псіхалагічнае імкненне народа да самаідэнтыфікацыі вылілася ў стварэнне БССР. Рэспубліка набыла фармальныя, але дэ-юрэ неабходныя атрыбуты дзяржаўнасці. Дзякуючы садзейнічанню ў тым ліку і цэнтральных улад у 20-я гады ў Беларусі быў закладзены трывалы фундамент дзеля самай шырокай яе беларусізацыі.

Аднак пачынаючы ўжо з 30-х гадоў гэты працэс не толькі запаволіўся, але і імкліва пайшоў назад. Беларуская культура, мова, традыцыі, нацыянальная адукацыя аказаліся выштурхнутымі на ўзбочча грамадскай свядомасці і сацыяльнай практыкі. З цягам часу большая частка насельніцтва краіны страціла карнявыя асновы нацыянальнай самаідэнтыфікацыі і перастала ўспрымаць сябе ў якасці суб’екта, здольнага да самастойнага соцыякультурнага быцця.

Набыццё дзяржаўнай незалежнасці адкрыла перад Беларуссю перспектыву выхаду ў новае гістарычнае вымярэнне. Адна з яго каардынат накіроўвае на фарміраванне ў менталітэце і сацыяльна-псіхалагічных установках людзей нязвыклага нам пачуцця – пачуцця адказнасці. Адказнасць – другі бок свабоды. Цяжар яе вялікі і многія, вельмі многія ў сілу мноства розных прычын – эканамічных, ідэалагічных, псіхалагічных, палітычных гатовы ад яе адмовіцца. Значна прасцей жыць, калі ёсць “старэйшы брат”, які за цябе вырашае, думае, адказвае. Уцёкі ад свабоды, аднак, азначаюць толькі адно – выбар на карысць рабства. Вонкава яно можа выглядаць іншым часам нават рэспектабельна. І ўсёж з гісторыі трэба атрымліваць урокі.

Гісторыя дала беларусам шанц на адраджэнне. Звычайна яго звязваюць з узнаўленнем дзяржаўнасці, неабходнасцю вяртання народу гістарычнай памяці і культурнай спадчыны. Гэта, безумоўна, так. У сучасных умовах

Библиотека БГУИР

памянёныя мэты трэба разглядаць у якасці звышзадач для нацыі, продкі якой былі гвалтоўна пазбаўлены нават права "людзьмі звацца". Разам з тым сапраўдны сэнс беларускай нацыянальнай ідэі палягае глыбей – ён у тым, каб, абапіраючыся на разгорнуты ў соцыякультурнай прасторы патэнцыял вышэйпералічаных яе "момантаў" і каштоўнасцяў адкрытага грамадства забяспечыць умовы для свабоднага развіцця свабоднай чалавечай індывідуальнасці.

Дзеля практычнага здзяйснення гэтых задач патрэбна, між іншым, вялікая культурная асветніцкая работа навукоўцаў, гісторыкаў, выкладчыкаў, дзеячоў мастацтва і літаратуры, сродкаў масавай інфармацыі, сістэмы адукацыі, а аб'ядноўваючым фактарам павінна быць адпаведная дзяржаўная праграма.

Наш невялікі вопыт жыцця ў незалежнай дзяржаве сведчыць: аднаго факту суверэнітэту дзяржавы недастаткова для ініцыявання трансфармацыйных працэсаў у свядомасці людзей. Патрэбна палітычная воля, патрыятычна арыентаваныя дзеянні ўлад, якія б ўздымалі, вялі народ да свабоды, але ніяк не апускаліся б самі на дно абывацельскай штодзённасці. Іх дэфіцыт на палітычнай сцэне Беларусі істотна запавольвае справы нацыянальнага адраджэння.

## 4.4. Праблемы сучаснай беларускай сацыяльнай сінэргіі

Тыя працэсы, якія адбываюцца зараз у Беларусі – гэта працэсы сінэргетычнага кшталту. На ўсіх узроўнях грамадскага быцця – эканамічным, сацыяльным, палітычным, духоўным назіраецца "супрацоўніцтва" рознаякасных, рознаскіраваных, шматгранных плыняў, дзеянняў і падзей. У сваёй сукупнасці яны групуюцца па лініях рацыянальнай інстытуалізацыі і індывідуальнай і індывідуальна-групавой спантаннасці. Першая рэалізуе сябе праз дзейнасць дзяржаўных структур і скіравана галоўным чынам на захаванне склаўшагася яшчэ ў савецкія часы статус кво ў сацыяльнай сінэргіі. Здзейсняемыя рэформы калі і "ідуць", то з'яўляюцца, па сутнасці, вымушаным водгукам на ціск аб'ектыўных тэндэнцый грамадскага развіцця. Перш за ўсё гэта тычыцца пераўтварэнняў у экономіцы. Апошнія з непазбежнасцю вядуць да з'яўлення новага сацыяльнага слою – прадпрымальнікаў, якія для адміністратыўна-каманднай сістэмы з'яўляюцца фактарам некантралюемым, а таму і непажаданым.

Зрухі ў рэфармаванні экономікі ў істотнай ступені залежаць ад палітычнай надбудовы грамадства. Асабліва ўзрастае роля палітычнай сферы ў перыяды цвішэнізму, г.зн. нестабільнасці, нявызначанасці, біфуркацыйнасці. Таму прыгледзімся да гэтай сферы больш уважліва.

З пункту гледжання сістэмнага падыходу, палітычная сфера грамадства – гэта адзінства ўтвараючых яе "элементнай базы" і структуры. Да першай трэба аднесці суб'ектаў палітычных дзеянняў (партыі, арганізацыі, рухі, сацыяльныя інстытуты і г.д.), якія ўдзельнічаюць у барацьбе за дзяржаўную

Библиотека БГУИР

ўладу, а таксама тыя палітычныя ідэі, праграмы, ідэялогіі, якія яны выкарыстоўваюць у гэтай барацьбе. Дзяржаўная ўлада – цэнтр прыцягнення палітычных сіл грамадства, мэта іх імкненняў, бо толькі мэтанакіраванае ўжыванне дзяржаўнага механізма дае магчымасць той ці іншай палітычнай партыі (ці асобе) здзейсніць на практыцы свае перадвыбарныя праграмы. Але улада не можа абапірацца толькі на сілу. Яна імкнецца быць легітымнай ў вачах грамадзян. Легітымнасць дае ёй магчымасць праводзіць у жыццё сваі рашэнні, абапіраючыся як на моц дзяржаўнага апарата, так і добраахвотную гатоўнасць грамадства іх выконваць.

Легітымнасць валадарства можа вызначацца вяршэнствам закона (прававая дзяржава), традыцыяй (традыцыйная дзяржава), харызмай лідара (харызматычная дзяржава). Зразумела, што гаворка ідзе пра "ідэальныя тыпы" М. Вэбера. У рэчаіснасці жа ўсе гэтыя моманты легітымнасці ўлады ўзаемапераплятаюцца, але ж з дамінаваннем адной з іх.

Што тычыцца сучасных працэсаў у Беларусі, то яны характарызуюцца станам невызначанасці, разрывам паміж формай (дэклараванымі ў Канстытуцыі нормамі) і зместам (рэальнымі дзеяннямі). Гэта, у прынцыпе, натуральна, бо станаўленне прававой дзяржавы – працэс, які патрабуе пэўнага часу. Ён залежыць не толькі ад волі і намаганняў асоб, груп, адпаведных сацыяльных інстытутаў, але і ад ступені сталасці грамадзянскага грамадства, наяўнасці ў духоўнай сінэргіі грамадства прававой культуры. Цывільнае грамадства грунтуецца на ўнутранай дыферэнцыяцыі соцыума, яго сегментацыі (па самых розных аснаваннях) на незалежныя ад улады структуры – эканамічныя, фінансавыя, палітычныя і г.д., здатныя да самарэалізацыі і росту пры любой змене палітычных эліт. Нягледзячы на разнастайнасць сваіх інтарэсаў, у прававой дзяржаве ёсць агульныя, аб'ядноўваючыя іх інтэнцыі і каштоўнасці. Важнейшымі сярод іх з'яўляюцца як раз ідэалы асветніцтва – свабода асобы, вяршэнства закона, рацыяналізм, гуманізм. Бяручы пад увагу гэтыя крытэрыі і ацэньваючы сучасную беларускую палітычную сінэргію, можна адзначыць, што галоўныя пераўтварэнні ў нашай краіне наперадзе.

Актыўнасць суб'ектаў палітычных дзеянняў вызначаецца наяўнасцю ў грамадстве адпаведнай палітычнай структуры, г.зн. той сукупнасці палітычных сувязяў і адносін, у якой разгортваецца іх барацьба за ўладу і праводзяцца ў жыццё праграмы. Гэтая структура мае пэўную юрыдычную "падкладку" і таму на заканадаўчым узроўні рэгулюе ўзаемаадносіны паміж усімі палітычнымі сіламі грамадства.

Па сваёй сутнасці яна можа быць альбо дэмакратычнай, альбо таталітарнай. Першая грунтуецца на падзяленні ўлад (як па "гарызанталі", так і па "вертыкалі") і іх незалежнасці адна ад адной, вяршэнстве закона, прыярытэце правоў і свабод чалавека, наяўнасці незалежных ад дзяржавы сродкаў mass media. Вобразна яе можна параўнаць з павуціннем. У другім тыпу палітычнай структуры ўся паўната ўлады канцэнтруецца ў адной "кропцы" (генсек, кароль, прэзідэнт і г.д.), асоба бяспраўна перад дзяржавай, сродкі mass

Библиотека БГУИР

media абслугоўваюць інтарэсы ўлады, у ранг закона ўзводзяцца патрэбы правячай групоўкі ці воля дыктатара. Назіральна такую структуру можна прадставіць у выглядзе трохкутніка ці піраміды.

І зноў, зыходзячы з дадзенай канцэптуальнай схемы, мы павінны адзначыць, што палітычная структура Беларусі знаходзіцца ў працэсе фарміравання. У ёй ёсць і “тое” і “гэтае”. Апошняя акалічнасць робіць яе няўстойлівай, што не можа не адбівацца на другіх сферах грамадскага жыцця.

Палітычны цвішэнізм, як адзначалася вышэй, з’ява гістарычна непазбежная. Разам з тым менавіта сфера палітыкі, палітычных дзеянняў з’яўляецца тым самым “пускавым механізмам”, які прыводзіць у стан руху ўсе астатнія сацыяльныя падсістэмы. Яны могуць у істотнай ступені паскорыць гэты рух, ці, наадварот, замарудзіць. Паскорыць – значыць скіраваць развіццё грамадства на сцвярджэнне, замацаванне і паглыбленне ідэалаў лібералізму ва ўсіх фрагментах грамадскага быцця. І, адпаведна, замарудзіць – значыць адцясніць краіну з кола сучаснага цывілізацыйнага руху. Тая ці іншая скіраванасць палітычнага механізму залежыць ад інтарэсаў у тым ліку і правячай палітычнай эліты

Ацэньваючы стан рэчаў у цэлым, можна сказаць, што беларуская палітычная сінэргія сёння характарызуецца дамінаваннем кансерватыўна-ахоўчай плыні. Яна абапіраецца на пастаянна растучую моц дзяржаўных структур і, што вельмі істотна, чаканне значнай часткі грамадства. Галоўным чынам гэта пенсіянеры, калгаснікі, нізкаадукаваныя і малакваліфікаваныя жыхары гарадоў. Супрацьдзейнічаючыя палітычныя сілы і інтэлектуальныя памкненні носяць хутчэй спантанна-стыхійны характар і маюць падтрымку ў неарганізаванай ні ў якія палітычныя партыі пэўнай часткі насельніцтва. Як сведчаць дадзеныя сацыялагічных апытанняў – гэта прадпрымальнікі і людзі з вышэйшай адукацыяй, моладзь. Нягледзячы на відавочную перавагу “сіл і традыцый старога грамадства” (Маркс), спантанна самаарганізуючыяся парасткі новага ўсё ж прабіваюць сабе дарогу і ў палітычным жыцці краіны.

Асновай для ўзаемапаразумення і ўзаемадзеяння розных палітычных сіл у сучасны момант можа стаць клопат аб пабудове прававой дзяржавы. Канцэнтрацыя на гэтай задачы дазволіць з цягам часу менш востра ўспрымаць рознагалоссе і тым самым падыйсці да рэалізацыі іншых момантаў нацыянальнай ідэі. Але пакуль што, падкрэслім гэта яшчэ раз, менавіта ідэя прававой суверэннай еўрапейскай дзяржавы павінна быць ядром беларускай палітычнай сінэргіі.

Каштоўнасці асветніцтва сталі “воссю” гісторыі заходняй цывілізацыі. Але ў кожнага з еўрапейскіх народаў яны апасродкаваны іх гістарычна-культурнай спадчынай, сістэмай палітычных, эканамічных і юрыдычных інстытутаў, а таксама асаблівасцямі менталітэту, нацыянальным характарам, станам духоўнай сінэргіі.

Нацыянальная ідэя – гэта вось, вакол якой круціцца кола гісторыі таго ці іншага народу. Яе змест і інтэнцыі засвойваюцца чалавекам праз адпаведныя

Библиотека БГУИР

механізмы сацыялізацыі і культурацыі асобы спакваля, самым натуральным і нязмушаным чынам. Гэты працэс ідзе як спантанна, стыхійна-выпадкова (скажам, у актах нефармальна-камунікатыўных інтэракцый), так і мэтаскіравана. Апошняя тэндэнцыя рэалізуе сябе праз пэўную сістэму фарміруючых асобу сацыяльных інстытутаў – выхаваўчых, адукацыйных, ідэялагічных, інфармацыйных, юрыдычных і інш. І вось тут самае галоўнае – гэта тып чалавека, якога грамадства і перад усім дзяржава робяць асноўнаю мэтаю сваіх выхаваўчых камунікатыўна-ідэялагічных уздзеянняў – сацыяльнага канфарміста, ці свабодную і адказную за свой лёс асобу. Для таго каб зразумець, хто і што мы ёсць, трэба суаднесці сябе з іншымі народамі і традыцыямі. І тут без паралеляў і параўнанняў не абысціся.

## 4.5. Каштоўнасці асветніцтва ў святле рэалій беларускай духоўнай сінэргіі

Свабода надежыць да фундаментальных экзістэнцыялаў чалавечага існавання. Праз яе робяцца магчымымі творчасць і гуманістычны тып чалавечых адносін. Разам яны ўтвараюць падваліны культурна-гістарычнага прагрэсу. Аднак сілы ўнутранай дэтэрмінацыі асобы заўжды вонкава абумоўлены – прыроднымі, сацыяльнымі, тэхнічнымі, ментальнымі і г.д. акалічнасцямі. І, як сведчыць вопыт гісторыі, часцей за ўсё апошнія ў цывілізацыях традыцыйнага тыпу бяруць верх і амаль поўнасцю іх сабе падпарадкоўваюць. Таму чалавек у традыцыйным грамадстве як здатная да самавызначэння асоба – гэта хутчэй гістарычны парадокс, чым сацыяльны факт.

Па-іншаму склаўся гістарычны лёс заходняй цывілізацыі і асобы. У сілу шэрагу разнастайных абставін (абмяркоўваць якія мы тут не маем магчымасці), ужо на сваім золку яна дэманструе прынцыпова іншы тып узаемадачыненняў паміж індывідам і вонкавымі ўмовамі яго жыццядзейнасці. Вынікам сталася стварэнне сацыяльных інстытутаў, прызначаных ахоўваць правы чалавека на індывідуальнае, аўтаномнае ад дзяржавы (поліса) быццё (прыватная ўласнасць, дэмакратычныя палітычны рэжым, судовая сістэма).

З часоў антычнасці сацыяльная творчасць ішла поруч з творчасцю духоўнай. Філасофія, мастацтва, навука, спорт – вось найбольш яскравыя яе дасягненні.

Старадаўняя Грэцыя – гэта своеасаблівае эксперыментальнае поле гісторыі з вельмі вузкімі, абмежаванымі ў прасторы і часе рамкамі. Сярод галоўных набыткаў гэтага эксперыменту – уяўленне аб чалавеку як здатнай да самавызначэння асобы. Разам з тым свабода антычнага грэка як грамадзяніна абмяжоўваецца яго полісам, а як мысляра і мастака – інтуіцыямі “міфапаэтычнай эпохі”.

Гэтыя абмежаванасці былі пераадолены хрысціянствам. Не адразу, зразумела, а ў выніку шматвяковага дыялогу з антычнай спадчынай, яе

Библиотека БГУИР

засвойвання і развіцця. Найбольш радыкальны крок быў зроблены ў эпоху Адраджэння, калі адбылося адкрыццё “чалавека ў гарызонце асобы” (У. Біблер), славутага майстра, які свабодна сябе вызначае і рэалізуе ў творчых дзеяннях. Адкрыццё “Я” сталася тым атрактарам, які абумовіў тэктанічныя зрухі ў самой тоўшчы хрысціянскага жыцця.

Аднак Рэнесанс ініцыяваў творчую актыўнасць толькі “верхняга” культурнага слоя, думкі і дзеянні якога мала закраналі інтарэсы мас. Ускалыхнула ж і прывяла ў рух “нізы” Рэфармацыя. Пратэстантызм блаславіў чалавека на ўпартую працу як богазаўгодную справу. Тым самым былі знятыя аковы з сіл унутранай дэтэрмінацыі чалавека і быў пакладзены пачатак пераўтварэнню асобы з гістарычнага парадоксу ў шырокі сацыяльны тып. Разняволены чалавечы дух перайначыў спачатку Стары, а потым і Новы свет. З меньшай ці большай інтэнсіўнасцю ў гэты працэс аказаліся ўцягнутымі усе цывілізаваныя краіны і народы.

ВКЛ апынулася ў самым віру гістарычных пертурбацый і супярэчніцтваў паміж Усходам і Захадам. Гэтая акалічнасць вельмі згубна адбілася не толькі на гістарычным лёсе Беларусі, беларускага народа, але і яго культуры, самасвядомасці, чалавеку як сацыяльным тыпе. Сумнаславутая “тутэйшасць” – гэта спадчына, ад якой мы яшчэ не хутка пазбавімся. У айчыннай літаратуры праведзена досыць грунтоўная праца па даследаванню эканамічных, сацыяльных, палітычных, ідэялагічных прычын “разбеларусвання” беларуса. Звернем увагу на некаторыя з іх.

Першая – падзел грамадства на вышэйшы і ніжэйшы слаі па моўным і рэлігійным прызнаках. Вышэйшы клас, адзіны здатны да стварэння інстытуалізаваных форм культуры – мастацтва, навукі, філасофіі, літаратуры, права і інш., аказаўся адсечаным ад каранёў айчыннай культуры. Таленавітыя выхадцы з нізоў, каб прабіцца “наверх” па неабходнасці былі вымушаны пераўтварацца ў “палякаў” ці “рускіх”. У рэшце сінэргетычны працэс “супрацоўніцтва” паміж народнай, фальклорнай культурай і культурай высокай, “прыгожай” таксама не адбыўся. Гэты факт асабліва ўражвае, калі яго суаднесці з адпаведным культурным працэсам на Захадзе. З часоў Адраджэння і Лютэра моўная мяжа паміж слаямі грамадства паспяхова пераадольвалася, што, як вядома, стала яшчэ адным чыннікам развіцця тамтэйшай культуры і асобы…

Другая – падзел беларускага соцыума па канфесіянальных веравызнаннях. Ён таксама адыграў дэзінтэгруючую ролю, прычым не толькі ў сацыяльнай, але і ў духоўнай сінэргіі. Рэлігія, як вядома, з’яўляецца вельмі важным фактарам кансалідацыі грамадства як у прасторы, так і ў часе. У айчыннай гісторыі ўсё адбылося з дакладнасцю наадварот. У пэўным сэнсе можна сказаць, што Беларусь стала полем нейкага містычнага экперыменту. Яго вынікам сталася выцясненне на перыферыю грамадскай свядомасці такіх істотных сацыяльных пачуццяў народа, як духаўнае адзінства, этнакультурная прыналежнасць, нацыянальная самасвядомасць. Супрацьборнічаючыя рэлігійныя канфесіі і плыні (праваслаў’е, каталіцызм, пратэстантызм, уніяцтва)

Бібліятэка БГУІР

пераследавалі перш за ўсё эканамічныя і палітычныя інтарэсы вонкавых сіл, мала дбаючы аб лёсе і гістарычным прызначэнні Беларусі, беларускага народа. Падзелы краіны , “перахрышчванні”, спусташальныя войны, “уцечка мазгоў”, гвалтоўныя перамяшчэнні найбольш таленавітых і майстаравітых людзей, адрыў ад адвечных каранёў, адсутнасць інтуітыўна ясных крытэрыяў нацыянальнай саматояснасці, невуцтва і цямрашальства (так, яшчэ напачатку 60-х гг. XIX ст. ў сістэме адукацыі Паўночна-Заходняга краю вучылася толькі 3% насельніцтва) – такі далёка не поўны спіс наступстваў “барацьбы за веру” на Беларусі.

Яшчэ адзін дысіпатыўны фактар духоўнай сінэргіі – этнакультурны разрыў паміж горадам і вёскай. На мяжы XIX-XX стст., згодна з першым перапісам насельніцтва імперыі (1897 г.) абсалютная большасць беларусаў (за 90%) жыла ў вёсках і мястэчках. У гарадах – цэнтрах кіравання, адукацыі, асветы, высокакваліфікаванай працы, сацыяльнай дынамікі жылі ў асноўным яўрэі, рускія і палякі (адпаведна статыстыцы вышэйзгаданага перапісу першыя складалі 14% усяго насельніцтва — гэта каля 1,5 млн. чалавек, другія і трэція — па 400 тыс.). Іх культурныя, духоўныя інтарэсы мелі сваю спецыфіку. Безумоўна, яны ўнеслі немалы ўклад у развіццё культуры Беларусі, але ўласная культура тытульнай нацыі заставалася для іх часта невядомай і чужой, акрамя адносна рэдкіх выпадкаў свядомага звароту рускіх ці польскіх даследчыкаў да праблем беларускай гісторыі і культуры.

Такім чынам, адсутнасць агульнанацыянальных чыннікаў адзінства (дзяржавы, мовы, рэлігіі, сістэмы адукацыі), пастаянны вонкавы ўціск прывялі да нябачанай у гісторыі іншых еўрапейскіх краін дэзінтэграцыі духоўнай сінэргіі беларускага грамадства. Адным з яе істотнейшых вынікаў сталася неразвітасць сіл унутранай дэтэрмінацыі соцыума і асобы. Разам з тым было б некарэктна ў святле гістарычных фактаў не бачыць узораў свабодалюбства з боку як грамадства (прыкладам, паўстанні), так і асобных індывідаў (тыя ж правадыры паўстанняў, вольнадумцы, рэвалюцыйныя дэмакраты, дзеячы адраджэнчага руху, так званыя нацыяналісты і г.д.). Але ўзгаданыя вышэй сілы вонкавай дэтэрмінацыі аказаліся мацнейшымі і абумовілі той ментальны склад і сацыяльны характар беларуса, аб якім пісаў Абдзіраловіч.

XX ст. стала часам важкіх зменаў у айчыннай гісторыі. Не ўсё, мабыць, ідзе так, як аб тым мараць рамантыкі. Але тут трэба разумець і бычыць наступнае.

Хаця шляхі Гасподні і нявызначаныя, гісторыя народаў залежыць усё ж ад іх уласных дзеянняў. Развіццё падзей на гэтай зямлі абумоўліваецца вялікім мноствам узаемаперакрыжоўваючыхся прычын, якія даюцца ў знакі як уяўна, так і патаённа. Вельмі важным наступствам іх узаемадзеяння ўжо зараз з’яўляецца паступовае зжыванне, “выціскание” з свядомасці нашых людзей рабскай псіхалогіі. Гэты працэс у розных сацыяльных груп працякае па-рознаму. “Крытычная маса” патэнцыяла свабоды непрыкметна, але няўхільна ўзрастае.

Бібліятэка БГУИР

Нам не дадзена бачыць працу “крата гісторыі”. Ён выконвае яе ціхімі, прыхаванымі рухамі. Вынікі яе часцей за ўсё выходзяць на паверхню знянацку, нечакана, з чым, аднак, людзі хутка зжываюцца. Гэтай нечаканасцю, новым адкрыццём для ўсё большай часткі беларусаў робіцца ўсведамленне ісціны, што па той бок свабоды будучыні ў Беларусі няма.

Сфармуляванае вышэй пытанне аб нашым месцы ў свеце можа падацца рытарычным: тысяча і адна нітка прывязвае нас да Расіі. Аднак, калі зазірнуць у дзень заўтрашні, то адказ на яго не здасца такім ужо відавочным. Расійскі культурна-гістарычны тып, часткай якога па-ранейшаму з’яўляецца Беларусь – гэта падзея сусветнага значэння. Яго рэфармаванне па заходнім узоры немагчыма ў прынцыпе, бо ў яго падмурку ляжыць іншая сістэма каштоўнасцяў (праваслаў’е, дамінаванне агульнага над асабістым, патэрналізм, месіянізм і г.д.).

Пытанне ў тым, наскольні глыбока і моцна мы да яго прывязаны. І ці варта ад яго “адрывацца”. Не толькі тэарэтычны аналіз, гістарычны вопыт, але і элементарны цвярозы розум падказвае: не проста трэба, але і жыццёва неабходна. “Адарвацца” – зусім не значыць стаць у пазіцыю канфрантацыі. Гэта, у рэшце рэшт, было б проста неразумна. Беларусь з’яўляецца тым рэгіёнам, дзе сыходзяцца, перакрыжоўваюцца палітычныя, эканамічныя, ваенныя інтарэсы розных краін і цывілізацый. У мінулым гэтая акалічнасць каштавала нам свабоды. Сённе свае геастратэгічнае становішча неабходна з максімальнай выгадай выкарыстоўваць у інтарэсах беларускага народа. І чым хутчэй прыйдзе ўсведамленне самакаштоўнасці, вяршэнства нацыянальных інтарэсаў, тым эфектыўней будзе раскрывацца гуманістычны патэнцыял беларускай нацыянальнай ідэі.

### 4.6. Тэарэтычныя асновы мадэлі беларускага асветніцтва

Нацыянальная ідэя – стрыжань мадэлі беларускага асветніцтва. Але адна да другой яны не зводзяцца. Асветніцтва, як адзначалася вышэй, – гэта не толькі сістэма каштоўнасцяў, ідэалогія, светапогляд, але і адпаведная сістэма сацыяльных інстытутаў, інстытуалізаваных і стыхійных дзеянняў. Таму стварэнне адэкватнай нацыянальным інтарэсам Беларусі мадэлі асветніцтва, гэта, па-першае, спосаб тэарэтычнага “спарадкавання” гістарычнай, сацыяльнай і культурнай сінэргіі беларускага грамадства; па-другое, гэта артыкуляцыя канстант сацыяльнага быцця нашага грамадства ва ўмовах сучаснага цвішэнізму і, па-трэцяе, памянёная мадэль павінна утрымліваць у сябе развівальны патэнцыял і для грамадства, і для асобы.

Згаданым крытэрыям у найбольшай ступені адпавядае ідэя свабоды. Свабода – гэта падваліна мадэлі беларускага асветніцтва, яе асноваўтваральны прынцып. Не ўваходзячы ў грунтоўны аналіз феномена свабоды, адзначым толькі, што ён мае два вымярэнні – вонкавае (сацыяльнае) і ўнутранае

Библиотека БГУИР

(асобаснае). Як сведчыць гістарычны вопыт, свабода як магчымасць самавызначэння асобы з'яўляецца абсалютнай каштоўнасцю літаральна для адзінак. Што тычыцца большасці людзей, то яны прыходзяць да ўразумення яе каштоўнасці (свядома ці падсвядома) праз знешнія чыннікі іх быцця – эканамічныя , палітычныя, юрыдычныя, бытавыя і г.д.

Функцыю своеасаблівага сацыяльнага "фрактайла свободы" ў сучаснай беларускай сінэргіі можа і павінна адыграць ідэя (і практыка) прававой дзяржавы, грамадзянскага грамадства, прававой самасвядомасці грамадзян. Дадзеная ідэя – другі важнейшы канструктыўны прынцып мадэлі нацыянальнага асветніцтва.

Каб вырашаць тыя праблемы, што стаяць сёння перад нашым грамадствам, трэба вызначыцца ў галоўным. Гэтая праблема – экзістэнцыяльная, чалавечая. Таму фарміраванне і выхаванне свабоднай асобы, гэта значыць індывіда, які здатны сам вызначаць сваё жыццё – матэрыяльнае, сацыяльнае і духоўнае – можа стаць яшчэ адным нашым агульным клопатам. Але вызначальная роля ў гэтым працэсе належыць мэтарацыянальным ідэялагічна-камунікатыўным дзеянням адпаведных сацыяльных арганізацый – сферы адукацыі ва ўсіх яе звёнах, сістэме mass media, установам культуры – адным сказам – інстытуалізаваным структурам духоўнай надбудовы грамадства.

Працэсы сацыяльнай і духоўнай сінэргіі вызначаюцца супярэчлівым характарам. Дамінаванне ў ім той ці іншай плыні ў кожны канкрэтна-гістарычны момант мае пад сабой пэўныя аб'ектыўныя асновы. Іх перабудова, утварэнне новай канфігурацыі вымагае вядомага часу і залежыць як ад мэтарацыянальнай актыўнасці суб'ектаў сацыяльных дзеянняў, так і ад стыхійных, неарганізаваных дзеянняў асобных індывідаў, груповак, сацыяльных маргіналаў. "Хітрасць гісторыі" (калі крыху перайначыць Гегеля) у тым, што яна заўжды выказвае сваю "волю да будычыні" менавіта праз дзейнасць маргіналаў, якіх улады і масы заўжды прыносілі ў ахвяру "сучаснасці" дзеля так званых стабільнасці і парадку. З тых часоў у чалавечай гісторыі нешта змянілася. Апазіцыя (ва ўсіх абліччах) – законная і неадымная частка сацыяльнай сінэргіі. Яе наяўнасць і роля ў грамадскіх працэсах з'яўляецца сёння паказчыкам меры цывілізаванасці і гуманнасці грамадства, практычнага здзяйснення правоў і свабод чалавека. Вось чаму яшчэ адной падвалінай нацыянальнай асветніцкай парадыгмы з'яўляецца ідэя гуманізма. У нашай краіне практычная рэалізацыя яе патэнцыялу ў нямалой ступені залежыць ад узроўню духоўнага развіцця правячай палітычный эліты, яе волі да правядзення ідэалаў асветніцтва ў жыццё, і, зразумела, ад агульнай каштоўнаснай скіраванасці грамадскай свядомасці.

Усялякі змест атрымлівае сваё вызначэнне праз пэўную форму. Асветніцкі працэс – не выключэнне. Аптымальным варыянтам яго разгортвання была б адпаведная сучасным інтарэсам беларускага грамадства моўна-культурная абалонка (форма). Але ў сілу склаўшыхся ў нашай гісторыі

Библиотека БГУИР

акалічнасцяў, гэты працэс аказаўся разарваным. Тое, што называецца беларусізацыяй, штучна запаволена і на нявызначаны час адсунута. Але гэта зусім не азначае непазбежнасці адхілення ці, тым больш, занядбання праблем нацыянальнага адраджэння. Спакваля работа ў гэтым кірунку доўжыцца. Але, на жаль, рупліўцам беларушчыны прыходзіцца разлічваць больш на ўласныя сілы, чым на дапамогу дзяржавы.

Вось чаму сёння мы павінны гаварыць аб дзвюх мадэлях нацыянальнага асветніцтва – аптымальнай (змест і форма знаходзяцца ў дыялектычным адзінстве) і рэальна магчымай. Апошні варыянт робіць наш шлях да Беларусі кружным і больш доўгім. Але, ідучы шляхам свабоды, мы ў рэшце надамо нашаму жыццю і адпавядаючую яго сутнасці культурную форму.

* * *

Прапанаваная мадэль (ці, дакладней, прынцыпы яе канструявання) абапіраюцца на тэарэтыка-метадалагічную базу канцэпцыі сацыяльнай сінэргіі. Яна дазволіла вылучыць асноваўтвараючыя катэгорыі, прааналізаваць асноўныя тэндэнцыі сучаснай беларускай дынамікі, асэнсаваць змест і значэнне беларускай нацыянальнай ідэі як каштоўнаснага стрыжня асветніцкай парадыгмы, абгрунтаваць мэтазгоднасць наяўнасці двух варыянтаў мадэлі асветніцтва, вызначыць вядучую ролю палітычнай волі ў падзеях сучаснага беларускага сацыяльнага цвішэнізму.

Библиотека БГУИР

## 5. Беларускае замежнае асветніцтва: вопыт XX стагоддзя

Ачагі замежнага беларускага асветніцтва ў XX стагоддзі фарміраваліся перш за ўсе як вынік трох асноўных хваль беларускай эміграцыі, што мелі месца ў пачатку, сярэдзіне і канцы стагоддзя. Пакінуўшыя Беларусь па розных прычынах і ў сілу розных абставін эмігранты першых дзвюх хваль эміграцыі былі несумненнымі носьбітамі (свядома ці не) спрадвечнай культурнай традыцыі. Ды й сама Беларусь у пачатку і нават у сярэдзіне стагоддзя была ў асноўным традыцыйным грамадствам з рашучай перавагай у ім сялянскага насельніцтва, якое зберагала ў больш–меншай ступені традыцыйную народную культуру. Чалавек такога традыцыйнага грамадства, вырваны воляй лёсу з кантэксту ўзгадаваўшай яго культуры, адчувае звычайна пастаянную настальгію, зберагае памяць пра сваю радзіму, імкнецца перадаць гэтую жывую памяць сваім дзецям і ўнукам. Гэта натуральная аснова для ўзнікнення і падтрымання ачагоў нацыянальнай культуры ў месцах больш менш кампактнага пражывання беларусаў, пакінуўшых Радзіму ў азначаны перыяд.

Такія ачагі з’явіліся ў свой час у Амерыцы і Канадзе, а таксама ў краінах Заходняй Еўропы, перш за ўсе ў Англіі, Германіі, Францыі, Італіі. Дзеясны патрыятызм прадстаўнікоў гэтых хваляў беларускай эміграцыі, якая, на жаль, ужо хутка сыйдзе з жыццёвай авансцэны, іх адданая памяць і пасільнае служэнне Радзіме, роднай культуры, што ўзгадавала і ўскарміла іх, праяўлялася ў розных і шматгранных формах. Прыкладам, які заслугоўвае павагі, можа быць дабрачынны стыпендыяльны фонд імя Кацярыны Карпенкі. Ён устаноўлены зараз на хімфаку БДУ, студэнткай якога яшчэ да вайны была цяперашняя жыхарка Амерыкі К.Карпенка.

Намаганнямі і самаахвярнымі высілкамі такіх адданых патрыётаў беларушчыны стваралася, падтрымлівалася і працягвала сваё існаванне культурна-асветніцкая дзейнасць беларускай дыяспары на працягу ўсяго мінулага стагоддзя ў многіх краінах свету. Добрым паказальнікам такой актыўнасці з’яўляецца беларуская перыёдыка на Захадзе, колькасць якой у XX ст. склала больш за 360 назваў. Дарэчы, сюды не ўваходзяць выданні ў краінах беларускага памежжа – Польшчы, Літве і Латвіі, а таксама на Украіне і ў Расіі. Пры гэтым 41 % адзначаных выданняў прыпадае на Амерыку і Канаду, 35% - на Германію, астатняе дзеліцца паміж Англіяй, Францыяй, Бельгіяй, Аўстраліяй і інш. краінамі. Асаблівай даўгавечнасцю вызначаецца газета "Беларус", якая пачала выходзіць яшчэ ў 1950 г. ў Нью-Йорку і не спыніла сваёй дзейнасці да сенняшняга дня. Трэба, аднак, удакладніць, што свядомая і мэтанакіраваная асветніцкая дзейнасць у асяродках замежнай беларускай дыяспары пачалася толькі тады, калі склад беларускай эміграцыі стаў папаўняцца інтэлігенцыяй і прадстаўнікамі больш-менш адукаванай часткі беларускага насельніцтва. Такія змены ў складзе беларускай эміграцыі прыйшліся на перыяд перад і пасля

Бібліятэка БГУІР

другой сусветнай вайны. Беларуская ж эміграцыя пачатку XX ст. складалася з сялян. "У большасці непісьменныя ці малапісьменныя, не маючы нацыянальна свядомых лідэраў і духавенства, эмігранты першай хвалі XX ст., нягледзячы на значную іх прысутнасць у замежных краінах, асабліва ў Паўночнай Амерыцы, не здолелі стварыць нацыянальна-арганізаванага жыцця. На пачатку стагоддзя іміграцыйныя ўлады амаль усіх краін не вылучалі беларусаў у асобную этнічную групу, адносілі іх да "рускіх" ці "палякаў". (Ляднёва А. Беларуская нацыянальная школа на эміграцыі. // Беларусіка, 1997, № 6, ч.2, ст. 103-104.

Плённая, перш за ўсе індывідуальна-творчая культурна-асветніцкая дзейнасць беларускай эміграцыі дапаўнялася і істотна пашыралася дзейнасцю розных інстытуцыялізаваных калектыўных суб’ектаў, што ўзнікалі і функцыяніравалі ў першую чаргу на аснове галоўных канфесійных суполак і аб’яднанняў, а таксама палітычных і грамадскіх арганізацый. Гэтыя формы заўсёды намнога больш устойлівыя да непазбежных асіміляцыйных уздзеянняў і ўплываў, што так ці інакш вызначаюць лёс усякай эміграцыі. У першай палове цяпер ужо мінулага стагоддзя найбольш значнымі інстытуцыялізаванымі суб’ектамі беларускага замежнага асветніцтва былі Беларускае навуковае таварыства ў Вільні і арганізаваны пры ім Беларускі музей імя І. Луцкевіча, Беларускі студэнцкі саюз, што аб’ядноўваў студэнтаў-беларусаў Віленскага універсітэта, Беларускі загранічны архіў у Празе, культурна-асветніцкае таварыства беларускай інтэлігенцыі "Беларуская хата" ў Латвіі. У пасляваенны час плёнам сваёй асветніцкай працы асабліва вылучаюцца Беларуская бібліятэка і музей імя Ф. Скарыны ў сталіцы Англіі, Беларускі інстытут навукі і мастацтва ў Нью-Йорку з філіяламі ў Германіі (Мюнхен) і Канадзе (Таронта), Беларуска-амерыканскае задзіночанне, Беларускі мастацка-выдавецкі клуб "Пагоня" ў Канадзе, Беларускі хаўрус у Францыі, Беларуская аўтакефальная праваслаўная царква на эміграцыі, дзейнасць якой пачалася ў Еўропе пасля вайны, а працягваецца ў Амерыцы, Канадзе, Аўстраліі.

Першая і другая сусветныя войны выклікалі самую вялікую ў гісторыі палітычную эміграцыю беларусаў, у выніку якой на Захадзе аказаліся некалькі сот тысяч нашых суайчыннікаў. У 50-я гады была прадпрынята спроба аб’-яднання ўсёй тагачаснай беларускай эміграцыі. Ініцыятарам такой спробы быў "Беларускі хаўрус" - старэйшая на сённяшні дзень грамадская арганізацыя беларускай эміграцыі ў Францыі, створаная ў Парыжы пасля вайны М.С.Абрамчыкам - з 1947 г.- прэзідэнтам Рады БНР (Беларускай народнай Рэспублікі). Спроба гэта не ўдалася з прычыны палітычных і рэлігійных разыходжанняў у эмігранцкім асяроддзі, што аднак не пашкодзіла актыўнай культурна-асветніцкай дзейнасці прыхільнікаў як БНР, так і БЦР (Беларускай Цэнтральнай Рады, створанай у 1943 г. на тэрыторыі Беларусі занятай немцамі. Прэзідэнтам Рады стаў Р.Астроўскі). З публіцыстычных, літаратурна-асветніцкіх выданняў беларускай эміграцыі таго часу можна назваць яшчэ даваенныя часопісы "Рэха" і "Бюлетэнь" і ўжо пасляваенны часопіс "Моладзь".

Библиотека БГУИР

Істотна іншая сітуацыя з беларускім асветніцтвам складвалася на тэрыторыях, якія былі адарваныя ад Беларусі ў выніку вядомых геапалітычных рашэнняў, што прымаліся галоўнымі суб’ектамі гістарычнага дзеяння, аб’яднаных антыгітлераўскай кааліцыяй у ходзе другой сусветнай вайны. Беларускае насельніцтва Беласточчыны, падзеленае паміж народна-дэмакратычнай Польшчай і савецкай Літвой, а таксама адышоўшых да Латвіі з карэнным беларускім насельніцтвам раёнаў былой Віцебскай губерні, апынулася на працягу больш чым 40 пасляваенных гадоў у сферы прамога дзеяння палітыкі і ідэалогіі, у якіх галоўнай дамінантай быў пралетарскі, а потым і сацыялістычны інтэрнацыяналізм, які легка прыносіў карэнныя нацыянальна-культурныя інтарэсы нацыянальных меншасцяў на ахвярнік адзінай прамяністай сацыялістычнай будучыні. Не менш інтэнсіўна гэты працэс ішоў і ў самой Беларусі, закранаючы ўсе яе этнічныя групы, але ж у першую чаргу – яе тытульную нацыянальную супольнасць. У той жа час гэткі інтэрнацыяналізм быў добрым прыкрыццем для рэальна праводзімай securitynovaнабытымі стратэгічнымі, ідэйна-палітычнымі саюзнікамі СССР дастаткова жорсткай асіміляцыйнай палітыкі ў адносінах беларускай нацыянальнай меншасці, што засталася ім. Гэта вельмі выразна праявілася ў дынаміцы зноса і разбурэння цэркваў і касцёлаў, кляштароў, убыванні ліку адпаведных прыходаў, колькасці беларускіх навучальных установаў, беларускамоўных выданняў.

Наколькі аператыўна і паслядоўна вялася асіміляцыйная палітыка новых улад у адносінах да беларускага насельніцтва яшчэ ў даваенны перыяд буржуазнай Польшчы і Латвіі сведчыць скарачэнне ў Польшчы беларускамоўных школ з 346 у 1918-1919 гг. да 1 прыватнай і 22 агульных у 1922 - 1925 гг., а ў Латвіі – з больш як з 50 у 1934 г. да 1 ў 1940 г. Красамоўнай ілюстрацыяй той жа палітыкі ў народна-дэмакратычнай Польшчы можа быць лёс беларускага этнаграфічнага музея ў горадзе Гайнаўцы, які быў заснаваны ў 1966 г., у 1973 г. закрыты, і толькі ў 1986 г. было пачата яго новае будаўніцтва і аднаўленне. Вельмі паказальны факт ужо з сенняшняга жыцця – непараўнальная асіметрыя адносна магчымасці атрымання адукацыі на роднай мове як галоўнай перадумовы нацыянальна-культурнага самазахавання і паспяховага процістаяння пагрозе асіміляцыйнага змяшэння, растварэння, і ў рэшце рэшт, поўнага знікнення для польскай дыяспары ў Беларусі і беларускай дыяспары ў Польшчы. Але калі беларускія грамадзяне, якія ідэнтыфікуюць сябе з польскай нацыянальнасцю, вучаць сваіх дзяцей у Беларусі ў месцах свайго кампактнага пражывання ў польскамоўных школах, дзе беларуская мова бытуе ў статусе і на правах замежнай мовы, то дзеці беларусаў Беласточчыны маюць магчымасць вывучаць у школе сваю родную беларускую мову толькі ў аб’ёмах вучэбных гадзін, якія адпускаюцца на авалоданне замежных моў.

Пры ўсім гэтым, у 1956 г. у Польшчы створана грамадская арганізацыя "Беларускае грамадска-культурнае таварыства" з цэнтрам у Беластоку, якое аб’ядноўвае больш 6 тыс. чалавек. У яго рамках дзейнічаюць секцыі

Бібліятэка БДУІР

літаратуры, асветы, культуры, выдавецкая, навуковая і лектарская, а таксама каля 200 гурткоў. Таварыства стала найбольш уплывовым і моцным трансіндывідуальным суб’ектам, правадніком і абаронцай беларускага асветніцтва ў Польшы, якое мае ў сваём актыве шмат пазітыўных дасягненняў і здабыткаў. Яно выдае штотыднёвую газету "Ніва", штогоднік "Беларускі каляндар", аб'ядноўвае і арганізуе 35 калектываў мастацкай самадзейнасці, а таксама літаратурна-мастацкае аб’яднанне "Белавежа". У Беластоку з 1957 г. вядуцца радыёперадачы на беларускай мове. Другой легальнай грамадскай арганізацыяй у Польшчы стала створаная ў 1981 г. "Беларускае аб’яднанне студэнтаў", а ў 1990 г. узнікла і першая тут палітычная партыя беларускага насельніцтва "Беларускае дэмакратычнае аб’яднанне", з сваім друкаваным органам "Беларускія навіны".

Наступным (глабальнага вымярэння) фактарам, які радыкальна змяніў геапалітычны ландшафт планеты і, адпаведна, ярка высвятліў праблему замежнага беларускага асветніцтва ўжо на зыходзе XX ст., стаў распад СССР – адзінай да тае пары дзяржавы, і вызваная ім хуткая трасфармацыя саюзных рэспублік у палітычна самастойныя краіны і гэтак жа хутка, нават можна сказаць, імгненна ператварыла усіх пражываўшых у гэтых рэспубліках беларусаў у прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў. Працэс вельмі балючы, супярэчлівы і неадназначны, які мае свае асаблівасці ў розных краінах СНД. З аднаго боку, на хвалі пад’ема ў іх нацыянальнай самасвядомасці, развіцця элементаў цывільнага грамадства, з’явіліся фармальна-прававыя магчымасці ўзмацнення грамадзянскай актыўнасці, у тым ліку ў культурна-асветніцкай галіне, і для прадстаўнікоў такіх меншасцей. Гэтыя магчымасці і былі скарыстаны. За кароткі час былі створаны і пачалі сваю дзейнасць беларускія культурныя згуртаванні ў краінах Прыбалтыкі, Украіне , Казахстане, 8 гарадах Расіі – Маскве, Санкт-Петярбургу, Цвяры, Калінінградзе, Мурманску, Петразаводску, Новасібірску, Ніжнім Ноўгарадзе.

З другога боку, у некаторых краінах, асабліва ў Латвіі, дзе беларуская дыяспара складае больш за 120 тыс. чалавек і зарэгістравана 7 беларускіх аб’яднанняў, на вельмі няпростае эканамічнае становішча яе прадстаўнікоў накладваецца і вельмі жорсткая палітыка "натуралізацыі" некарэннага насельніцтва, якая патрабуе хуткага і даволі добрага авалодання дзяржаўнай мовай як неабходнай умовай атрымання паўнацэннага грамадзянства і ўраўноўвання ў правах. Сення, напрыклад, кошт грамадзянства ў Латвіі складаеца не толькі з намаганняў па здачы экзамена на валоданне латышскай мовай, але і з 50 доларавага грашовага ўзносу. Такі цяжкі рэжым выжывання пакідае мала рэальных магчымасцей для намаганняў па зберажэнню і развіццю нашай роднай культуры. Не кожнаму беларусу той жа Рыгі па кішэні падтрымліваць нават непасрэдныя сувязі, проста наведваць мерапрыемствы, скажам, таварыства беларускай культуры "Прамень", якое не мае свайго ўласнага памяшкання і за 10 гадоў існавання змяніла 12 месцаў знаходжання, а праезд у канец горада абыходзіцца жыхару латвійскай сталіцы ў 1,5 долара.

Гэтыя турботы і клопаты пераважна бяруць на сябе адносна вузкія групы гуманітарнай інтэлігенцыі ці бізнэсу беларускага паходжання. Работа, тым не менш, праводзіцца дастаткова важкая і значная, накіраваная на зберажэнне і развіццё нацыянальнай самасвядомасці, засваенне духоўных і культурных каштоўнасцяў беларускага народа, вывучэнне яго гісторыі і мовы, падтрыманне сувязяў з культурна-асветніцкімі цэнтрамі Беларусі – Беларускім фондам культуры, Нацыянальным навукова-асветніцкім цэнтрам імя Ф.Скарыны, аб’яднаннем беларусаў свету "Бацькаўшчына".

Так, у той жа Латвіі культурна-асветніцкую дзейнасць беларускай дыяспары вызначаюць і накіроўваюць два культурна-асветніцкіх таварыствы "Світанак" і "Прамень", пры якіх створаны і дзейнічаюць 2 ансамблі беларускай народнай песні, дзіцячыя мастацкія калектывы, выдаецца газета, наладжана беларуская перадача на латвійскім тэлебачанні, працуе беларускамоўная школа. Сярод праведзеных у 2000 г. таварыствамі мерапрыемстваў асабліва вылучаюцца "Дыпламатычны салон" як спроба паказаць Беларусь, яе культурныя і працоўныя дасягненні шырокім грамадскім колам Латвіі, кіраўніцтву краіны, прадстаўнікам замежных дыпламатычных місій, а таксама фестываль беларускай культуры, рамёстваў і мастацтва, які доўжыўся 12 дзён. Гэтыя акцыі спрыялі пацяпленню грамадскага клімату ў краіне, зніжэнню атмасферы насцярожанасці, недаверу ў адносінах да "чужакоў.

Шмат плённых перспектыў узмацнення, стабілізацыі і актывізацыі дзейнасці беларускай дыяспары на абшарах былой савецкай краіны, набыцця ёю трывалай фінансавай базы як галоўнай перадумовы яе жыццяздольнасці і далейшага выжывання абяцае вопыт, што накопліваецца ў Комі - рэспубліцы Расіі, дзе беларусы складаюць пятую па сваёй колькасці нацыянальную супольнасць пасля рускіх, украінцаў, татар і саміх комі. Там прадпрыемствы, якія ўзначальваюцца беларусамі і якія бяруць на сябе значную долю па фінансаванню, дзейнасці культурна-асветніцкіх органаў беларускай культурнай аўтаноміі, становяцца асновай фарміравання апякунскіх саветаў, перад якімі рэгулярна даюць справаздачу кіраўнікі такіх органаў. Прадпрыемствы ж стараюцца камплектаваць свае калектывы беларусамі. Тым самым гарантуецца, з аднаго боку, трываласць фінансавага забяспячэння культурна-асветніцкай дзейнасці беларускай дыяспары ў гэтым рэгіене, з другога ж боку, ствараюцца спрыяльныя перадумовы для ўсвядамлення кожным нашым суайчыннікам сваёй нацыянальнай годнасці. Тут разумеюць, што поўная і вынікова-плённая самарэалізацыя асобы, прыгнечанай комплексам нацыянальнай непаўнацэннасці, немагчыма ў прынцыпе.

Сучаснае беларускае замежнае асветніцтва ў змястоўным плане не з’яўляецца адзіным і аднародным. У ім можна вылучыць розныя тэндэнцыі, звязаныя з неаднолькавым успрыманнем і адносінамі да гістарычнага мінулага Беларусі, асабліва савецкага мінулага, розным разуменнем галоўных вектараў яе сучаснага і будучага развіцця, культурна-гістарычнай і духоўнай асновы нацыянальнай беларускай самасвядомасці і нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, а

таксама неадназначнай ацэнкай і адносінамі да сённяшняй сітуацыі ў Беларусі і ў галіне нацыянальнай асветы, адукацыі і культуры. Умоўна кажучы, беларусы краін СНД прадстаўляюць усходні вектар у сучасным замежным беларускім асветніцтве, беларусы за межамі краін СНД – вектар заходні. Савецкае мінулае і сучасная палітыка ў самой Беларусі, арыентаваная на аднаўленне разбуранай саюзнай дзяржавы, успрымаюцца і ацэньваюцца першымі ў асноўным пазітыўна, другімі – пераважна негатыўна.

Адзінае, што можна з упэўненасцю канстатаваць, гэта супадзенне пазіцый усіх нашых суайчыннікаў далекага і блізкага замежжа, ангажаваных беларускім асветніцтвам, – гэта цяжкія перажыванні і не сціхаючы боль за гаротнае, сірочае становішча роднай мовы на самой яе бацькаўшчыне.

Драматызм сучаснага нацыянальна-культурнага асветніцтва (і зусім не толькі беларускага) у тым, што яно вельмі часта і вельмі спрытна скарыстоўваецца мандыялізмам – галоўным геапалітычным суб’ектам сучаснага гістарычнага працэсу ў якасці разменнай манеты для паскоранага і непазбежнага ўзвядзення "агульначалавечага дома" з яго немінучым касмапалітызмам, разбурэннем нацыянальна-культурных традыцый і нацыянальнай дзяржаўнасці, фарміраваннем і штампоўкай ацураўшыхся свайго роду і племені "грамадзян свету".

У свой час, больш за паўстагоддзя таму многія носьбіты беларускай ідэі ў сваіх чыстых імкненнях былі ўжо, што называецца, па поўнай праграме скарыстаны носьбітамі "германскага духа". Сення гісторыя беларускай ідэі пайшла па тому ж вітку.

На другой сесіі 3-га Міжнароднага кангрэса беларусістаў пад назвай "Беларуская культура ў дыялогах цывілізацый" старшыня Аргкамітэта кангрэса, прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў А. Мальдзіс са шкадаваннем адзначыў, што любоў ЮНЕСКА да Беларусі набывае ўсе больш "платанічны характар", выразам чаго стала скарачэнне напалову сродкаў, паабяцаных на фінансаванне работы Кангрэса. Безумоўна, фінансавая падтрымка гэтай арганізацыяй беларускай культуры заслугоўвае самай шчырай і вялікай падзякі. Аднак за 52 гады, прайшоўшыя з часу заснавання ЮНЕСКА, адбыліся карэнныя геапалітычныя зрухі. Сёння пастулаты і прынцыпы ЮНЕСКА адносна культуры, прынятыя 50 год таму, працуюць адназначна на глабалізацыю, апошняя ж непахісна вядзецца толькі ў адным і тым жа рэчышчы – рэчышчы лібералізму празаходняга, дакладней нават, – праамерыканскага кшталту і, адпаведна, на карысць ўжо цалкам аб’яднанага Захаду.

А што такое сёння паслядоўны лібералізм у адносінах да культуры, мы добра бачым на павучальным вопыце жорсткага, безальтэрнатыўнага яго насаджэння і ўкаранення на абшарах былой адзінай савецкай краіны. Там, дзе яго пераможнае шэсце не сустракае ніякіх перашкод, асноўнай масе насельніцтва ўжо не да культуры, працегці б толькі сваё фізічнае існаванне. Цікава і адначасова вельмі смешна ў сувязі з гэтым назіраць і чуць безупынныя

Библиотека БГУИР

крыўды ды скаргі на сённяшняе жабрацкае становішча культуры ад тых зорных прадстаўнікоў былой савецкай культурнай эліты, якія дасягнулі вышынь сваёй творчасці, прызнання і славы ў той, яшчэ савецкі час, а зараз з пазіцыі ўжо злобнага і непрымірымага антысаветызму аддана змагаюцца за хутчэйшае і радыкальнае ўсталяванне ў сваіх краінах каштоўнасцяў лібералізму, які сёння амаль цалкам, да нераспазнавальнасці супадае з амерыканізмам. А яго "найноўшая" сацыяльная ідэя – ідэя "таннай дзяржавы", лозунг "як мага меней дзяржавы і як мага болей цывільнага грамадства". Цывільнае ж грамадства, як вядома, складаюць толькі свядомыя заможныя людзі, якія ў стане самі, і толькі для сябе аплачваць і ўтрымліваць патрэбную ім культуру у неабходнай для іх колькасці і якасці.

І калі асветніцтва – гэта не што іншае як мэтанакіраванае ўсталяванне і распаўсюджанне ў грамадстве духоўных каштоўнасцяў найбольшай, вышэйшай сацыяльнай значнасці і важнасці, то сення на долю ўсіх астатніх, каму не пашчасціла працісnуцца ў вузкае кола "цывільнага грамадства", застаецца ўжо не святло сапраўднай культуры, а нешта зусім процілеглае - непраглядная цемра настырнай, усюдыпранікальнай поп- і маскультуры, якой так шчодра "духоўна акармляе" нас амерыканізаваны Захад. Побач з крытэрыямі векавечнай культурнай традыцыі гэта поўнасцю несумяшчальныя полюсы, плюс і мінус, святло і цемра грамадскага быцця. І сапраўдны клопат пра асвету абавязкова павінен сёння быць звязаны з ясным усведамленнем гэтай процілегласці і несумяшчальнасці. Так званае “адкрытае грамадства” , якое нясе , навязвае нам сённяшні лібералізм, і “танная”, мікраскапічная ў сваіх грамадскіх функцыях дзяржава - гэта ўжо канчатковая, беззваротная гібель, разбурэнне, знішчэнне астатніх рэштак нацыянальных культурных традыцый, якім у адзіноту, без мер дзяржаўнага патэрналізма не выстаяць перад знішчальным валам агрэсіўнай масавай псеўда-, дакладней, контркультуры.

І тым не менш, менавіта ў такім геапалітычным кантэксце, які не пакідае амаль ніякіх надзей нацыянальным культурным традыцыям, падвіжніцкія намаганні ўсіх, як імянітых, так і сціплых у сваей невядомасці працаўнікоў, рупліўцаў і змагароў за выжыванне, і нават адраджэнне нацыянальнай беларускай культуры заслугоўваюць ўдзячнасці і усялякай падтрымкі.

Беларускай дзяржаве, калі яна сапраўды зацікаўлена і хоча, каб беларуская нацыянальная асвета не марнела, не перарывалася і не знікала ў замежжы акрамя ўсякай, перш за ўсе матэрыяльнай яе падтрымкі, неабходна нацыянальна арыентаваць асвету і адукацыю тут, у самой Беларусі. І справа гэта не дапускае ўжо ніякага далейшага прамаруджвання.

Библиотека БГУИР

# Заключэнне

Разгледжаныя тэарэтычныя і канкрэтна-культурныя праблемы і рэаліі духоўнай сінергіі дазваляюць зрабіць наступныя высновы:

1. Працэсы сучаснай духоўнай сінергіі вызначаюцца няўстойлівасцю, няпэўнасцю, няпрадказальнасцю.
2. Адным са спосабаў выйсця грамадства са стану біфуркацыі з'яўляецца дыялог культур.
3. Сэнс дыялогу — узбагачэнне каштоўнасцяў гуманізма, салідарнасці, узаемаразумення паміж народамі.
4. Адукацыя — сфера сацыялізацыі асобы і важнейшы інструмент духоўнай сінэргіі.
5. Вызначальнымі атрактарамі «дрэйфу» беларускай культуры і ментальнасці з'яўляюцца каштоўнасці дэмакратыі, правоў чалавека, духоўнага плюралізму.
6. Рэфармаванне беларускай сістэмы адукацыі і асветніцтва павінна здзейсняцца як з улікам ідучых у свеце працэсаў інтэграцыі, так і акцэнтавання своеасаблівасцяў нацыянальных культурна-гістарычных каштоўнасцяў.

Библиотека БГУИР

## ЛІТАРАТУРА


1. Абдзіраловіч I. Адвечным шляхам. – Мн., 1993.
2. Беларусь паміж Усходам і Захадам. Праблемы міжнацыянальнага, міжрэлігійнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу. Часткі 1,2. //Беларусіка, 1997, № 6. Мн.: Нац. навук.-асветн. цэнтр ім. Ф. Скарыны.
3. Беларусы: Этнаграфія, дэмаграфія, дыяспары, канфесіі. Атлас. Фонд фундамент. даследаванняў Рэспублікі Беларусь. Мн., 1996.
4. Бирало А.А. Философская и общественная мысль Белоруссии и Литвы конца XVII – сер. XVIII в. Мн., 1971.
5. Бирало А.А. Философские проблемы в науке эпохи просвещения в Белоруссии и Литве. Мн., 1979.
6. Гісторыя Беларусі. У дзвюх частках / Пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. Мн., 1998.
7. Дорошевич Э.К. Философия эпохи просвещения в Белоруссии. Мн., 1971.
8. Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии: Избр. произв. XIX – нач. XX в. Мн., 1962.
9. Идеи материализма и диалектики в Белоруссии. Мн., 1988.
10. Идеи гуманизма в общественно-политической и философской жизни Белоруссии. Мн., 1977.
11. Кантакты і дыялогі. Інфармацыйна-аналітычны і культуралагічны бюлетэнь. Мн., 2000, № 9 (57).
12. Круталевич В.А. История Беларуси: становление национальной державности. Мн., 1999.
13. Культура беларускага замежжа / Беларусіка, № 5. Мн., 1995.
14. Кутырев В. Челюсти рационализма // Свободная мысль. 2000, № 9.
15. Майхрович А.С. В поисках истинного бытия и человека. Мн., 1992.
16. Мальдзіс А.І. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мн., 1980.
17. Миттельштрис Ю. Много ли просвещения нужно человеку? // Человек. 1995. № 6.
18. Мысліцелі і асветнікі Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1995.
19. Новая постиндустриальная волна на западе. Онтология. М., 1999.
20. Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии. Мн., 1972.
21. Падокшын С.А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі. Мн., 1990.
22. Падокшын С.А. Унія, дзяржаўнасць, культура. Мн., 1998.
23. Саверчанка І. Aurea mediocritas. Мн., 1998.
24. Смоліч А. Геаграфія Беларусі. Мн., 1993.
25. Сыракомля У. Добрыя весці. Мн., 1993.
26. Хоркхаймер М., Адорна Т. Диалектика просвещения: Философские фрагменты. М-СПб, 1997.
27. Харин Ю. От хаоса – к гармонии. // Беларуская думка. Мн., 2000, № 8.
28. Цукерман А.Я. Філасофская думка Беларусі сяр. XVIII ст. Мн., 1989.
29. Шалькевіч В.Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі. Мн., 1997.


Библиотека БГУИР

# Рэцензія

на рукапіс брашуры «Духоўная сінэргія: адукацыя і асветніцтва».

Веды, асветніцтва і адукацыя належаць да найважнейшых набыткаў цывілізацыі. У сваей сукупнасці яны утвараюць механізм, праз які передаецца соцыякультурны вопыт ад аднаго пакалення да другога, а таксама здзейсняецца працэс сацыялізацыі асобы. Характар і функцыянаванне гэтага механізма залежыць ад многіх чыннікаў, галоўнымі сярод якіх з'яўляюцца светапоглядныя імператывы соцыўма, яго практычныя патрэбы, жадаемы тып асобы.

Сення, ва ўмовах пашырэння працэсаў глабалізацыі (якія знітоўваюць ў адно цэлае эканомікі розных краін, іх фіскальныя інстытуты, а таксама інфармацыйныя прасторы) істотную ролю адыгрывае і сфера адукацыі. Яна палягае ў тым, каб, па-першае, выпрацаваць новую адукацыйную парадыгму, адпавядаючую выклікам XXI ст., па-другое, стаць на справе "мастом" між рознымі культурамі, па-трецяе, забяспечыць умовы для паўнацэннага станаўлення і развіцця асобы, скіраванай на каштоўнасці чалавечай салідарнасці і гуманізма.

Выкладзенныя ў працы тэарэтычныя пытанні спалучаюцца з аналізам праблем  іх практычнага здзяйснення. У прапануемым дапаможніку побач з філасофскім асэнсаваннем праблем адукацыі і асветніцтва разглядаецца канкрэтны — беларускі — кантэкст (гістарычны, культурны, палітычны, ідэялагічны) іх развіцця і ўвасаблення. Даследаванне дзеючых тэндэнцый гэтага працесу дае цэласнае ўяўленне аб рэчаіснасці, ад якой у многім будзе залежыць вобраз Беларусі ў XXI ст. Справядліва падкрэсліваецца, што вызначальнымі атрактарамі «дрэйфу» беларукай культуры і ментальнасці з'яўляюцца каштоўнасці дэмакратыі, правоў чалавека, духоўнпга плюралізму. А рэфармаванне беларускай сістэмы адукаціі і асветніцтва павінна здзейсняцца як з улікам ідучых у свеце працэсаў інтеграцыі, так і акцэнтавання своеасаблівасцяў нацыянальных культурна-гістарычных каштоўнасцяў. Рэцэнзіруемая праца, падрыхтаваная калектывам аўтараў, бюдзе карысным дапаможнікам для студэнтаў і аспірантаў у справе асэнсавання імі рэалей сучаснай духоўнай сінергіі і асобістым самавызначэнні.

Доктар філасофскіх наук, прафесар    Латыш М.І.

Библиотека БГУИР

Зв. план 2002. паз. 66

Вучэбнае выданне

**Габрусь** Іван Фёдаравіч,

**Міськевіч** Уладзімір Іосіфавіч,

**Харын** Юрый Андрэевіч.

# ДУХОЎНАЯ СІНЭРГІЯ: АДУКАЦЫЯ І АСВЕТНІЦТВА

Навучальны дапаможнік па курсу філасофіі
для студэнтаў і аспірантаў

Рэдактар Т.М. Крукава
Кампьютэрная верстка Е.Г. Реут

| | | |
|---|---|---|
| Падпісана да друку 27.08.2002. | | Фармат 60x84 1/16. |
| Папера афсетная. | Друк рызаграфічны. | Ум.-др.арк. 3,6. |
| Вуч.-выд.арк. 3,6. | Тыраж 200 экз. | Заказ 531. |

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі»
Ліцэнзія ЛП № 156 ад 05.02.2001.
Ліцэнзія ЛВ № 509 ад 03.08.2001.
220013, Мінск, П. Броўкі, 6.

Библиотека БГУИР